Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ І ЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР

XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

СУБОТА 28 МАЯ 1932 г. № 117 (3496)

ТЭЛЕФОНЫ:

Адказн. рэдактара 7-09
Адказн. сакратара . 4-78
Сэктароў 9-15
Начная рэдакцыя . 12-55 (два званка)
Выдавецтва . . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц . . 1 руб
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „

Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.

Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА

МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ

1 радка нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ

аб зьезде 1 дакументу—2р.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ. ПЕРАДАВЫ: Забясьпечыць перамогу на льняных палёх. В. ШЧАРБАКОЎ. Навуковыя кадры БССР у 2-й пяцігодцы (2 стар.). В. ЛЯХАЎ. Новы закон аб сельгаспадатку—у працоўныя масы сялянства (2 стар.) ВЯЧ. ПАЛЕСКІ. Крок у другое пяцігодзьдзе (3 стар.).

Баявое прывітаньне трэцяму пакаленьню (1 стар).

Перадавікі 3-й бальшавіцкай—кандыдаты на прэмію (1 стар.).

Змамць стаўку на самацёк: у выкананьні плянаў кантрактацыі (2 стар.).

Рыхтаваць баявую сустрэчу асеньня-зімоваму грузапатоку (3 стар.).

5-га чэрвеня Усебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталёвай прамысловасьці (4 стар.).

Усебеларуская конфэрэнцыя па навукова-дасьледчай рабоце у БССР у 2-й пяцігодцы (4 стар.).

Ліст у рэдакцыю (4 стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ. Напады фашысцкіх банд на рэвалюцыйных рабочых. Белабандыцкі прытон Дэтэрдынга у Берліне.

Тав. Літвінаў выехаў у Жэнэву.

Забясьпечыць перамогу на льняных палёх

У сваім дакладзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б) тав. Сталін аднэй з чарговых агульных задач партыі высунуў «праблему правільнага разьмяшчэньня вясноўных галін сельскай гаспадаркі па СССР, праблему спэцыялізацыі на цных вобласьцяй па сельска-гаспадарчых культурах і галінах». Тав. Сталін гаварыў тады, што пры дробна-сялянскай гаспадарцы, гаспадарцы няўстойлівай, пазбаўленай неабходных рэзэрваў, немагчыма сур'ёзнае правядзеньне спэцыялізацыі і што «цяпер, калі мы перайшлі да буйнай гаспадаркі і забясьпечылі ў руках дзяржавы рэзэрвы зярна, мы можам і павінны паставіць сабе задачу правільнай арганізацыі спэцыялізацыі па культурах і галінах».

Канкрэтызацыю гэтай чарговай агульнай задачы партыі даў XVI зьезд УсеКП(б) у дакладзе тав. Якаўлева, у прыватнасьці ў сфармуляваным ім лёзунгу ператварэньня так званай спажываючай паласы (да якой адносіцца і БССР) у паласу вырабляючую, у паласу лёну, мяса і малака.

За тыя амаль поўныя два гады, якія адзяляюць нас ад XVI зьезду, мы далёка крочылі наперад па шляху ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы партыі.

У бягучым годзе нам патрэбна зрабіць новы буйны крок наперад. Нам трэба зноў пашырыць пасеўныя плошчы пад лёнам і канаплямі давёўшы іх да 370 тыс. га, падняўшы пад лён 320 тыс. га. Да тэмпаў ростту лёнаводзтва мы закліканы пастановамі XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) аб паляўчэньні ў два-тры разы снабжэньня прамысловага насельніцтва нашай краіны прамысловымі таварамі, задачамі стварэньня моцнай сыравіннай базы для нашай лёгкай індустрыі, задачамі спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Мы абавязаны гэтыя тэмпы утрымаць. Мы ня маем права зьніжаць гэтыя тэмпы, бо зьнізіць тэмпы значыцца адстаць «адсталых б'юць».

Заданьне, якое дадзена нашай партыі і ўрадам у галіне разьвіцьця лёнаводзтва ў бягучым годзе, абсалютна рэальна. Аб гэтым красамоўна сьведчыць той факт, што пляны, будучы спушчаны на пэрыфэрыю, быў падтрыманы рабочымі саўгасаў, мільённым калгасным сялянствам і масамі беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, што ў радзе месц ударнікі бальшавіцкіх палёў выкунулі сустрэчныя значна павялічаныя пляны. Выкананьне пляну бягучага году значна палягчаецца далейшым ростам тэхнічнай узброенасьці нашага лёнаводзтва, ужо не гаворачы аб тым багатым вопыце, якім узброіліся мы за дзьве папярэднія бальшавіцкія вясны.

Аднак, перамога на лёнавых палёх самацёкам ня прыдзе. Гэтую ПЕРАМОГУ ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ. Аналіз апошніх пасеўных зводак НКЗему БССР пераканаўча сьведчыць, што ТЭМПЫ СЯЎБЫ ЛЁНУ ЗУСІМ НЕДАСТАТКОВЫ. Мы засеялі на 20 мая ўсяго толькі 6,96 проц. пляну.

Гэта—нікуды нявартыя, ганебныя тэмпы! Прычына такіх павольных тэмпаў—У праваапартуністычнай стаўцы на самацёк («яшчэ пасьпеем», «яшчэ пасеем»), у дрэнным арганізацыі працы, асабліва ў калгасным сэктары, у недастаткова канкрэтным, недастаткова апэрацыйным і гнуткім, у непаваротлівым кіраўніцтве, у слабой масавай палітыка-растлумачальнай рабоце сярод аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў, дрэнным расстаноўцы сіл партыйцаў і камсамольцаў на палёх.

Разгарнуўшыйся, згодна рашэньню ЦК КП(б)Б, пасеўны штурм на палёх павінен даць рашучы пералом. Трэба дабіцца максімальнага скарыстаньня машыннай і жывой цягі, пасеўных машын, трэба дабіцца высокай дысцыпліны і прадукцыйнасьці працы на палёх калгасаў і саўгасаў. Трэба дабіцца ў рэзультаце масавай палітычнай работы, а не камандваньня, рашучага павышэньня тэмпаў сяўбы і ў аднаасобным сэктары. Ніводнага прагула, ніводнага нявыхаду ў поле, ўсю рабочую сілу—на сяўбу!,—вось баявы лёзунг сёньняшняга дню.

Трэба памятаваць, што КОЖНЫ ПРАПУШЧАНЫ ДЗЕНЬ НЯСЕ НАМ ЗЬНІЖЭНЬНЕ ЎРАДЖАЮ, ЗНАЧНЫЯ СТРАТЫ ЛЁНУ, нясе паслабленьне сы равіннай базы нашай лёгкай індустрыі, у прыватнасьці тэкстыльнай.

Але барацьба за колькасныя паказьнікі павінна быць цесна зьвязана з БАРАЦЬБОЙ ЗА ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ. Рашаючае значэньне тут мае шырокае ўжываньне агратэхнікі. Трэба скончыць з нядбайнымі адносінамі да задач аўладаньня агратэхнікай, якія зьяўляюцца нічым іншым, як яскравым праяўленьнем правага апартунізму на практыцы. Усе навейшыя дасягненьні агратэхнікі павінны быць руша ны на палі, на барацьбу за высокі ўраджай лёну. Пэўная глыбіня ўзорваньня, сяўба чыстым адсартаваным насеньнем і т. д.—гэтыя элемэнтарныя патрабаваньні агратэхнікі павінны быць выкананы чаго-б там ні стала. І гэта, значна палегчыць другі, ня менш адказны, этап барацьбы за высокі ўраджай—праполачную кампанію.

Мы павінны шырока папулярызаваць прасьцейшыя мерапрыемствы праполачнай, як-то праполку на 15—20 дзень пасьля сяўбы, калі сьцябло лёну дасягне 10—15 см., выкананьне праполачных работ у найкарочшы тэрмін (максымум 10 дзён), паўторную праполку (праз 10—15 дзён пасьля першай праполкі) пры вялікай засьмечанасьці пасеву, абкошваньне межнікаў, канаў, абочын, шляхоў. Мы павінны расказваць масам рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства аб значэньні гэтых работ для барацьбы са стратамі ў лёнаводзтве, для барацьбы за высокі ўраджай. Мы павінны падняць на выкананьне гэтых работ шырачэзныя масы рабочых і працоўных.

Барацьба за якасьць, за высокі ўраджай лёну павінна стаць у цэнтры нашай ўвагі. Мы—краіна самага буйнага, самага перадавога земляробства ПАВІННЫ ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ УРАДЖАЙНАСЬЦЬ ЛЁНАВЫХ ПАЛЁЎ ПЕРАДАВЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН, павінны дагнаць Бельгію, дзе 1 га дае 10 цнт. лёнавалакна, павінны дагнаць Галяндыю, дзе 1 га дае 14 цнт. лёнавалакна, тады як у сярэднім па СССР мы з аднаго га зьбіраем усяго толькі 2,7 цнт., а ў БССР і таго менш: усяго 2 цнт.

У барацьбе за перамогу на лёнавых палёх рашаючае значэньне мае правільнае, канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва калгаснай брыгадай. Трэба памятаць, што ў брыгадзе зараз рашаецца лёс тэмпаў сяўбы, будзе рашацца поспех праполачнай кампаніі. Гэтага нельга выпускаць з пад увагі. Тэму асноўным нашым патрабаваньнем павінна быць: узмацніць кіраўніцтва брыгадай, канкрэтна дапамагаць брыгадзе ў арганізацыі працы, ў расстаноўцы рабочай сілы і машын, у правільным скарыстаньні сіл партыйцаў і камсамольцаў, разгарнуць масавую палітычную работу ўнутры брыгады.

У песнай сувязі з барацьбой за высокі ўраджай і высокія тэмпы сяўбы, падрыхтоўкай і правядзеньнем праполачнай кампаніі знаходзіцца пытаньне аб кантрактацыі. Мы з гэтай справай значна адсталі і спазьніліся. Плян кантрактацыі лёну павінен быў быць выкананы да пачатку масавай сяўбы, між тым кантрактацыя—гэты магутны сродак фарсаваньня тэмпаў і павышэньня якасьці палявых работ — не закончана дагэтуль. Пасеўны штурм трэба зьвязаць з завяршэньнем кантрактацыі. ЗАКОНЧЫЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ ГЭТА АЗНАЧАЕ ЗНАЧНА прасунуць наперад і самую пасеўную кампанію. Гэты мі днямі НКЗем БССР зьвярнуўся з хадайніцтвам у СНК БССР аб вылучэньні і завозе прамтавараў за кошт фондаў кантрактацыі ў лёнаводчыя раёны. Няма ніякага сумненьня, што гэтае мерапрыемства паскорыць завяршэньне кантрактацыі і адыграе буйную ролю ў якасьці стымулу пасьляховага правядзеньня пасеўнай і праполачнай кампаній.

Апошняе пытаньне, на якім неабходна спыніцца—гэта ЛЁНАЗАГАТОЎКІ. Мы дагэтуль далёка ня выканалі плян загатовак лёну і пянькі ўраджаю 1931 г., прычым з наступленьнем весны навых палявых работ у многіх раёнах зусім закінулі гэтую работу. Забыліся аб сваёй задоўжанасьці і рэспубліканскія арганізацыі, якія вядуць загатоўкі лёну, спынілі займацца загатоўкамі і... пераключыліся на кантрактацыйную работу. У гэтым факце надзвычайна ЯСКРАВА ВЫЯВІЛАСЯ НЯЎМЕНЬНЕ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗЛУЧЫЦЬ У АДНО РАД ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, АПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА РАСКЛАДВАЦЬ РАБОТУ «У ЧАРГУ» ПА ПОЛАЧКАХ... Гэты факт—сур'ёзная перасьцярога і сур'ёзны вурок. БССР—адна з магутных лёнаводных баз Савецкага Саюзу павінна змагчы ў бліжэйшыя-ж дні закончыць загатоўкі лёну і пянькі ўраджаю 1931 году закончыць кантрактацыю лёну ўраджаю бягучага году і выйсьці з гонарам, пераможцай з пасеўнай і праполачнай кампаній.

Гэта—наш абавязак.

Задача гэта—складаная і пяжкая. Але ці-ж ёсьць цытадэлі, якіх бальшавікі не змаглі-б ўзяць?! «Рэальнасьць нашай праграмы,—гаварыў тав. Сталін,—гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да перамогі, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян». У рашучай барацьбе з кулаком, з яго агентурай ў радах партыі—правымі і «левымі» апартуністамі, у рашучай барацьбе з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк і «левацкім» адміністраваньнем мы атрымаем перамогу і на вучастку лёну, як атрымлівалі перамогі на ўсіх іншых вучастках вялізарнай будоўлі бясклясавай сацыялістычнай грамады.

Перадавікі 3-й бальшавіцкай—кандыдаты на прэм'яваньне

БАБРУЙСК. 18 мая калгас ІМЯ ВАРАШЫЛАВА поўнасьцю скончыў сяўбу.

Ударнымі тэмпамі работы і ўкараненьнем агратэхнікі калгас дабіўся вы кананьня паказьнікаў конкурсу.

20 мая пасьпяхова скончылі сяўбу калгасы «ЭНЭРГІЯ», ІМЯ ВАРОЎСКА ГА і «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА»

Старшыня райкалгасаюзу ШАМКО.

ЧЭРЫКАЎ. Калгас «ЧЫРВОНЫ СОРМАВЕЦ» уключыўся ў конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы і 25 мая пасьпяхова скончыў сяўбу ярыны.

Старшыня праўленьня калгасу СІНЕНКА.
Сакратар парт'ячэйкі БЛЯХ.

***

ВОРША. (Па тэлеграфе ад нашага кар.). Рад перадавых калгасаў Аршаншчыны, у адказ на апошнія пастановы ЦК і СНК, па-ўдарнаму датэрмінова скончылі сяўбу.

Калгас «ЛЕНІНСКІ ПРЫЗЫЎ» скончыў сяўбу 24 мая, «3-ЦІ ГОД ПЯЦІГОДКІ», «ЧЫРВОНЫЯ НАВАСЁЛКІ», «ЧЫРВОНЫ БЕРАГ»—26 мая.

Калгас «ЧЫРВОНЫ БЕРАГ» узяў на грамадзкі буксір адстаючы калгас «НОВЫ СЬВЕТ». Туды накіравана буксірная брыгада з пяці лепшых калгасьнікаў з шасьцю конямі.

***

БАБРУЙСК. (Па тэлефоне ад наш. кар.). Сельскагаспадарчы камбінат 25 мая скончыў сяўбу раньніх, гародніх і палявых культур. Плян зярнёвых культур перавыкананы на 17 га і гародніх—на 14 га.

Раньняе скончэньне сяўбы сельска-гаспадарчаму камбінату забясьпечылі правільная арганізацыя працы, увядзеньне на ўсе вучасткі работ зьдзельшчыны, чоткая расстаноўка сіл і сродкаў вытворчасьці на галоўныя вучасткі сяўбы.

***

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Калгас «Мер куры». Варатынскага сельсавету 20 мая, на пяць дзён раней тэрміну окончыў сяўбу, выканаўшы сустрэчны плян, які на 45 га перавышае плян вы значаны райкалгасаюзам.

У адказ на пастановы ЦК і СНК аб збожжа і жывёлазагатоўках, калгас абавязаўся засеяць 20 га зьвыш пляну і гэтае абавязацельства з гонарам вы канаў.

Высокі энтузіязм калгасьнікаў характарызуецца тым, што ніводная калгасная брыгада не дапусьціла недавыкананьня норм на працягу ўсёй сяўбы.

Асобныя калгасьнікі, як напрыклад, ПАРАХЛЕВІЧ ІГНАТ, ПАРАХЛЕВІЧ РЫГОР і інш. дабіліся выпрацоўкі па ворыве 1,5 га пры норме ў 0,65 га.

Усяго калгасам засеяна 165 га. Сяўба скончана на працягу 9 дзён.

Скончыўшы сяўбу калгас «Меркуры» пераключаўся на дапамогу суседнім калгасам.

Бабруйск. 27-V. (Па тэлефоне ад нашага кар.) Сычкоўскі і Варатынскі сельсаветы скончылі веснавую сяўбу. Сычкоўскі сельсавет выканаў плян сяўбы на 111 проц.

***

Барысаў. (Наш. кар.) Калгас «Чырвоны баец», Карсакаўскага сельсавету на падставе ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, дзякуючы правільнай арганізацыі калгасных брыгад і разгортваньню паміж імі сацпаборніцтва і ўдарніцтва 19 мая скончыў сяўбу яравых культур.

Па некаторых культурах плян перавыкананы. Аўса па пляне трэба было засеяць 12 га, засеяна 27, ячменю засеяна 16 га, замест 10 па пляне. Пшаніцы засеяна 12 га, бульбы 65 га, лубіну на насеньне 4 га імш. Зьвыш пляну засеяна 7 га позьняга лубіну.

Зараз калгасьнікі заканчваюць сяўбу гародніны разгортваюць сяўбу лёну.

***

Калгасьнікі калгасу «Бязбожнік», Пухавіцкага р. абгаварваюць пастановы ЦК і СНК аб збожжа і жывёлазагатоўках.

Барысаў. (Наш кар.). Дзякуючы разгорнутаму сацпаборніцтву і ўдарніцтву паміж калгасамі і брыгадамі. Земсінскі сельсавет, пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі становіцца ў рады перадавікоў трэцяй бальшавіцкай сяўбы. Перадавыя калгасы «Савецкая Каменка», «Ударнік» заканчваюць сяўбу.

На пастановы ЦК і СНК аб збожжа загатоўках і жывёлазагатоўках, на новы дэкрэт аб сельгаспадатку калгасьнікі, беднякі і сераднякі—аднаасобнікі Зембінскага сельсавету адказалі ўзмацненым тэмпаў сяўбы. На 21-е мая па сельсавеце засеяна звыш 60 проц. апушчанай пасеўплошчы.

ЦК КП(б)Б—Гікало, СНКБ—Галадзеду, НКЗБ—Рачыцкаму, „Зьвязда"—Гарыну

ЖЫТКАВІЧЫ. (маланка) 27-V. Раён скончыў сяўбу, выканаў плян на 102 проц. Па бульбе — 107 проц., па лёну — 111 проц., па аўсу—113 проц. Змагаемся за выкананьне сустрэчнага пляну да 30 мая.

Сакратар РК КП(б)Б і старшыня пасеўтройкі БАГДАНАЎ.
Старшыня РВК БУЦЬКО.
Заг. Райза БУЯНАЎ.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Напады фашысцкіх банд на рэвалюцыйных рабочых

БЭРЛІН, 26. Крывавыя сутычкі, якія адбыліся 25 мая ў Прускім ландтагу, паслужылі сыгналам да нападаў нацыянал - сацыялістаў на рэвалюцыйных рабочых. На працягу 2-х дзён у Бэрліне і Гамбургу адбываліся справажаныя фашыстамі цяжкія сутычкі. Ва ўсходнім рабочым раёне Бэрлін зьявілася каля 200 нацыянал - сацыялістаў, якія з халоднай зброяй на кінуліся на праходзіўшых міма рабочых.

Недалёка Штэтынгскага вакзалу 150 нацыянал - сацыялістаў напалі на працаваўшых каля вакзалу рабочых і адкрылі стральбу з рэвальвэраў. На адным пляцу ў 2 гадзіны нацыянал-сацыялісты, узброеныя нажамі, напалі на рабочых. Некалькі чалавек паранена.

У Гамбургу Альтоне таксама мелі месца крывавыя сутычкі паміж нацыянал - сацыялістамі і рэвалюцыйнымі рабочымі. Асабліва цяжкія сутычкі адбыліся ў Альтоне. Пры сутычках у Гамбургу паранена трое рабочых.

РАССТРЭЛ ДЭМАНСТРАЦЫІ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ВАРШАВА, 26. У Тарыні адбыліся выступленьні беспрацоўных, якія наладзілі два мітынгі і дэманстрацыі. Дэманстранты расьсеяны паліцыяй, якая пусьціла ў ход агнястрэльную зброю. Двое беспрацоўных цяжка паранены. Некалькі дзесяткаў чалавек лёгка паранены.

Выступленьні беспрацоўных адбыліся таксама ў Пятрыкове. Беспрацоўныя ў колькасьці 500 чалавек зьявіліся да будынку старостваа, патрабуючы хлеба і работы. Каля будынку паліцыя напала на дэманстрантаў, прычым зьбіла 20 чалавек. Некалькі дзесяткаў дэманстрантаў арыштавана.

Крывавыя падзеі ў ляндтагу— нападкі фашыстаў

БЭРЛІН, 26. Агідны напад нацыянал - сацыялістаў на камуністычных дэпутатаў у Прускім ляндтагу выклікаў сярод працоўных вялізарнае абурэньне і трывогу. Увесь германскі друк спыняецца падрабязна на крывавых падзеях у ляндтагу. Нават дэмакратычны і сацыял - дэмакратычны друк змушаны ня скрываць, таго, што нацыянал - сацыялісты, якія былі ў большасьці, справажвалі сутычку. Пры гэтым асабліва актыўную ролю адыгралі кіраўнікі «забароненых» ваенных арганізацый нацыянал - сацыялістаў.

Як ужо ўказвалася ў адозьве ЦК КПГ напад нацыянал - сацыялістаў быў выклікан шалёнствам апошніх з прычыны таго, што камуністычная фракцыя ўнесла прапанову, якая дадычыцца патрабаваньняў беспрацоўных і пры разглядзеньні якой нацыянал - сацыялісты былі-бы вымушаны выкрыць сябе, як агентаў капіталу. Ужо з самага пачатку паседжаньня ляндтагу з радоў нацыянал - сацыялістаў раздаліся крыкі па адрасе камуністычных дэпутатаў: «з вамі мы яшчэ палічымся». Яны таксама, як у Рэйхстагу спрабавалі інсцэнізаваць бойку, для таго, каб сарваць паседжаньне ляндтагу і тым самым адтэрмінаваць абгаварэньне камуністычнай прапановы і пазбавіцца галасаваньня.

У сувязі са здарэньнямі ў Ляндтагу «Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг» ставіць пытаньне, ці не гаворацъ гэтыя здарэньні аб пераходзе да грамадзянскай вайны. Правая «Лёкаль - Анцайгер» лічыць, што палітычныя рэзультаты сутычкі яшчэ цяжка прадбачыць. Гэтая газэта разам з усім іншым правым друкам выказвае сваё задаволеньне з прычыны нацыянал-сацыялістычнага нападу. Гітлераўскі друк разглядае ўчарашнія здарэньні як перадзьвер'е да наступу былой імперскай супроць рэгалюцыйнага рабочага руху.



ПАД УДАРАМІ КРЫЗІСУ. Таварны двор у Дэтройце (ПАЗШ). Усе работы

Белы тэрор лютуе

ВАРШАВА, 26. У горадзе Роўна пачаўся працэс 60 рабочых і сялян Сарненскага павету, якія абвінавачваюцца ў «камуністычнай дзейнасьці» і «у прыналежнасьці да сельробу». Працэс працягнецца, відавочна, каля тыдню.

Амэрыканскія самалёты бамбардыруюць паўстанцаў

НЬЮ-ЁРК, 26. «Асошыэйтд прэс» паведамляе, з Манаго (Сталіца Нікарагуа), што амэрыканскія самалёты бамбардавалі пазыцыі паўстанчаскай арміі Сандыно ў раёне Прынсафолко, на Атлянтычным беразе. 17 чалавек забіта.

Польска-Данцыгскі канфлікт

БЭРЛІН, 26. Дыплёматычны прадстаўнік Польшчы ў Данцыгу зьвярнуўся да Данцыгскага ўраду з нотай пратэсту супроць аказанага Данцыгскай уладай пакравіцельства адбыўшайся ў Данцыгу канфэрэнцыі саюзу немцаў за границай, у той час, як дэманстрацыі польскіх скаўтаў у Данцыгу былі забаронены. Нота кваліфікуе паводзіны данцыгскай улады, як яўнае парушэньне Парыжскай згоды.

***

БЭРЛІН, 26. У сувязі з прапагандай, якая вядзецца ў Данцыгу афіцыйнымі польскімі органамі супроць Данцыгу, Данцыгскі сэнат уручыў энэргічную ноту пратэсту дыплёматычнаму прадстаўніку Польшчы ў Данцыгу.

Падрыхтоўка да антываеннага міжнароднага кангрэсу

БЭРЛІН, 28. Адозва Горкага, Лёграна, Барбюса і іншых аб скліканьні 28 ліпеня ў Жэнэве міжнароднага кангрэсу супроць імпэрыялістычнай вайны спаткала гарачы водгук сярод працоўных многіх краін. У Германіі створаны ініцыятыўны камітэт для падрыхтоўкі кангрэсу. У камітэт уваходзяць лева настроеныя мастакі і вучоныя. У Баўгарыі і Польшчы створаны такія-ж самыя камітэты. Гэтыя камітэты будуць праводзіць сумесна з левымі арганізацыямі адкрытыя прафсаюзныя сходы. Асаблівае значэньне надаецца выбарам рабочых - дэлегацый ад прафсаюзаў, заводаў і культурных і пралетарскіх арганізацый. Шырокая кампанія будзе таксама праводзіцца на вёсцы.

Вываз золата з ПАЗШ узрастае

НЬЮ-ЁРК, 26. На Нью-Ёрскай біржы працягваецца рэзкае падзеньне акцый і аблігацый. Падзеньне долара на замежных біржах выклікае ўзмоцнены вываз золата. Учора было вывезена больш чым на 20 мільёнаў

Забастоўка вугляко-паў у ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. 25-5. Больш 50.000 вугляко-паў у штатах Огайо і Ілінойс працягваюць баставаць у сувязі са зьніжэньнем заработку. Паміж палітыкай Огайо і вугляко-пам адбываюцца перастрэлкі. Губарнатар Огайо паслаў 240 салдат у бастуючы раён Огайокіх копей, дзе забастоўшчыкі прадоўжаваюць масавае пікетаваньне.

Забастоўка паштавікоў ахапіла увесь Кітай

НАНКІН, 25-5. Паштовыя служачыя Бэйпіну, Цзяньцзіну, Цзынані, Хунчжоў, Анцзі, Сучжоў, Чжэчжоў, Таньцзіну, Фучжоў, Усі і Ценчжоў далучыліся да забастоўкі шанхайскіх паштавікоў і парашылі падтрымліваць патрабаваньні шанхайскіх забастоўшчыкаў. Паштовыя служачыя Лаяну таксама далучыліся да забастоўкі.

ШАНХАЙ, 26-5. Забастоўка паштавікоў распаўсюдзіліся на ўсю краіну. Дадаткова забаставалі паштовыя служачыя ў Цінлао (буйны порт/ правінцыі Шандунь), Кайпына (галоўны горад правінцыі Хэнань), а таксама невялікіх гарадоў правінцый Фэдэй і Шандунь. Адначасова паштовыя служачыя правінцыі Шансі, і Суйюай абвесьцілі гатоўнасьць далучыцца да забастоўкі.

Белабандыцкі прытон Дэтэрдынга ў Берліне

БЭРЛІН, 26. Як паведамляе левая «Вэльт ам Абэнд» берлінская кантора Дэтэрдынга, так званая фірма «Эльдэко» ў сапраўднасьці зьяўляецца белагвардзейскім цэнтрам. Дырэктар «Эльдэко» Фон-Кнорынг знаходзіцца ў цеснай сувязі з так званым «палітыка-эканамічнымі інфармацыйным бюро», за якім хаваецца нацыянал - сацыялістычны інфармацыйны апарат, цэнтр якога знаходзіцца ў Мюнхэне.

Выезд т. Літвінава ў Жэнэву

МАСКВА, 26. Старшыня савецкай дэлегацыі на канфэрэнцыі па раззбраеньню

Баявое прывітаньне-трэцяму пакаленьню!

Выкуем дастойную здаровую зьмену!

3-му пакаленьню бальшавікоў важаку мас дзетвары — юным ленінцам да 10-ці гадовага юбілею — БАЯВОЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД БАЛЬШАВІКОЎ БЕЛАРУСІ.

Вам, дзецям пралетараў і калгасьнікаў, пераможна будуючым сацыялізм пад кіраўніцтвам партыі Леніна, прыдзецца канчаткова ўстанавіць камуністычнае грамадзтва.

Вы носіце імя Ўладзімера Ільліча Леніна.

Вывучайце-ж слаўны шлях барацьбы бальшавікоў за сацыялізм, выкоўваючы з сябе дастойную, здаровую зьмену камсамолу і партыі.

Дні свайго слаўнага юбілею скарыстайце для яшчэ большага загартаваньня сваіх радоў, змагайцеся за якасьць вучобы, за сьвядомую дысцыпліну, за сапраўднае правядзеньне асноўных дзяцей!

Няхай жыве дзіцячая камуністычная арганізацыя юных піянэраў імя Ўладзімера Ільліча Леніна!

Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр тав. Сталін!

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Бярэце прыклад з лепшага ленінца

Горача вітаю піянэрыю і ўсю працоўную дзетвару БССР з дзесяцігадовым юбілеем піянэрарганізацыі. Многія сотні і тысячы барацьбітоў за сацыялізм вырасьлі за гэтыя гады з радоў піянэрарганізацыі. Яны стаяць поплеч са сваімі старэйшымі на адказнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляючыся прадстаўнікамі таго пакаленьня, якое здольна пабудаваць камунізм».

Пасьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва яшчэ больш узьнімае ролю і значэньне піянэрарганізацыі.

Піянэры! Уперад пад сьцягам Леніна, пад верным кіраўніцтвам кампартыі і яе ленінскага ЦК на барацьбу за канчатковую перамогу сацыялізму. Бярэце прыклад з лепшага ленінца-правадыра міжнароднага пралетарыяту тав СТАЛІНА!

А. Чарвякоў.

Піянэр—прыклад усім дзецям

Юным піянэрам—ленінцам у дзень 10-ці годзьдзя слаўнай піянэр. арганізацыі—палкае бальшавіцкае прывітаньне ад Прэзыдыуму Цэнтральнага Савета Прафсаюзаў Беларусі.

Пралетарская дзетвара Савецкай Беларусі зьяўлялася і зьяўляецца актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва, актыўным барацьбітом за справу будаўніцтва сацыялізму.

У барацьбе за падрыхтоўку з дзетвары працоўных, сьвядомых і актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадзтва,—піянэр. арганізацыя зьмагры і выключную ролю. Піянэр арганізацыя за гады [illegible] дох партыі і камсамолу, паказваюць прыклады бальшавіцкіх тэмпаў на вытворчасьці, на колгасных палёх, кіруюць адказнымі вучасткамі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў упэўнен, што піянэры Савецкай Беларусі і надалей будуць прыкладам усім дзецям у вучобе, у барацьбе за сьвядомую піянэрскую дысцыпліну, у барацьбе за палітэхнічную школу, за камуністычнае выхаваньне.

Няхай жыве 10-я гадавіна піянэр. арганізацыі—баявы ўзгляд камуністычнага выхаваньня дзяцей!

Піянэр—ударнік вучобы!

Піянэрам і школьнікам Савецкай Беларусі з прычыны 10-годзьдзя піянэрскай арганізацыі пасылае гарачае прывітаньне Народны Камісарыят Асьветы БССР.

Юныя ленінцы Савецкай Беларусі, у першыя рады барацьбітоў за палітэхнічную школу, за аўладаньне асновамі навук, за сьвядомую дысцыпліну, за камуністычнае выхаваньне.

Юныя ленінцы, дзеці працоўных усіх нацыянальнасьцяй, будзьце прыкладам усім дзецям у барацьбе за інтэрнацыянальнае брацтва працоўных, за інтэрнацыянальнае выхаваньне!

Піянэр—ударнік вучобы.

Школа—галоўны вучастак работы.

Юныя піянэры, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК, у барацьбу за справу Леніна, справу сусьветнага Кастрычніка, будзьце гатовы!

ПЛАТУН.

Узмацняйце барацьбу за палітэхнічную школу!

Юныя піянэры! У дні вашага 10-ці годзьдзя Цэнтральны Камітэт Ленінскага камсамолу Беларусі шле палкае камсамольскае прывітаньне.

Піянэрскі рух пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшавікоў і Ленінскага камсамолу дасягнуў вялізарных посьпехаў на фронце камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У дні 10-ці годзьдзя піянэрскай арганізацыі на вас, юныя ленінцы, Ленінскі камсамол і партыя ўскладаюць вялікія адказныя задачы. КОЖНЫ З ВАС ПАВІНЕН МАБІЛІЗАВАЦЬ УСІХ ДЗЯЦЕЙ ПРАЦОЎНЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПЕРАБУДОВУ ШКОЛЫ Ў САПРАДНУЮ ПАЛІТЭХНІЧНУЮ, за якасьць школьнай вучобы так, каб да канца навучальнага году ня было ніводнага другагодніка. Узмацняйце палітэхнічную работу ў зьвяне, атрадзе, школе.

Асноўная задача камсамольскіх ячэек і калектываў—умацоўваць дзіцячы камуністычны рух падрыхтаванымі моцнымі кадрамі кіраўнікоў піянэратраду. Кожная камсамольская ячэйка павінна вылучыць з свайго складу лепшых камсамольцаў на работу піянэратраду.

Піянэры! Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, умацоўвайце піянэрскія рады, уцягвайце новыя дзесяткі тысяч дзяцей працоўных у піянэрскую арганізацыю!

Няхай жыве слаўнае 10 годзьдзе піянэрарганізацыі і яе непасрэдны кіраўнік—Ленінскі камсамол!

Няхай жыве камуністычная партыя і яе правадыр—т. Сталін! ЦК ЛКСМБ

Усім культпропам райкомаў КП(б)Б, загадчыкам раённа і старшыням раённых камітэтаў саюзу працасьветы

Разгортваньне конкурсу на лепшую палітэхнічную школу і настаўніка праходзіць яўна незадавальняюча.

Прапануем пад Вашу асабістую адказнасьць узмацніць кіраўніцтва, тэрмінова дабіцца належнага пералому, разгарнуўшы шырокую растлумачальную работу сярод настаўніцтва, рабочых, калгасьнікаў з прыцягненьнем да ўдзелу гаспадарнікаў і кіраўнікоў устаноў.

Конкурс павінен выявіць ступень выкананьня пастаноў партыі аб школе і мабілізаваць на барацьбу за іх рэалізацыю ўсю пралетарскую грамадзкасьць.

конкурсе цесна ўвязаць з задачамі заканчэньня бягучага і падрыхтоўкай да новага навучальнага году.

Рэдакцыям раённых газэт, шматтыражкам, насьценгазэтам прадпрыемстваў, МТС, саўгасаў і калгасаў шырока асьвятляць ход конкурсу.

Інфармацыю аб ходзе конкурсу забясьпечыць дасылкай інфсводкі к 1 чэрвеня 1932 году.

НАМ. КУЛЬТПРОПУ ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

НАРОДНЫ КАМІСАР АСЬВЕТЫ БССР ПЛАТУН.

СТАРШЫНЯ ЦП ПРАЦАСЬ

В. Ляхаў

Новы закон аб сельгаспадатку ў працоўныя масы сялянства

Апублікаваны ў першых чыслах мая новы закон аб сельскагаспадарчым падатку, побач з пастановамі партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках і парадку гандлю калгасаў, калгасьнікаў і працоўных сялян-аднаасобнікаў, зьяўляецца адным з мерапрыемстваў вялізарнага палітычна-гаспадарчага значэньня і разьлічан на **далейшае ўзмацненьне і рост сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, на шырокае разгортваньне гаспадарчай ініцыятывы і самадзейнасьці шырачэйшых калгасных мас, на новы магутны вытворчы ўздым».**

Зусім яскрава, што гэтыя мерапрыемствы **павінны даць і дадуць** далейшы шпаркі рост зярнёвай гаспадаркі, паскарэньне вырашэньня мясной праблемы, а адсюль і палепшаньне снабжэньня і ўцягненьне ў тавараззарот вялізарных новых дадатковых рэсурсаў.

Усе гэтыя мерапрыемствы арганічна зьвязаны з генэральнай лініяй партыі і цалкам з яе вынікаюць. «Ня бачыць гэтай сувязі—значыць не разумець ні супрасьць генэральнай лініі партыі, ні тых сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія мы на сёньняшні дзень маем» (перадазы «Известий» № 132).

Няма ніводнай капіталістычнай краіны, дзе-б падатки не расьлі шалёнымі тэмпамі; у гэты-ж час у нас, у Савецкім Саюзе, ня гледзячы на значнае ня вялічэньне грашовых даходаў вясковага насельніцтва (з 13,2 млрд. руб. у 1930 г., 19,1 млрд. руб. у 1931 г. да 22,4 млрд руб. у 1932 годзе) і далейшае ня вялічэньне капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку **разьмер сельскагаспадарчага падатку ў 1932 годзе нават зьніжаны ў параўнаньні з мінулым годам.**

Сельскагаспадарчы падатак на ўсіх этапах разьвіцьця нашае гаспадаркі зьяўляецца адным з важнейшых сродкаў у справе сацыялістычнай перабудовы вёскі і пасьпяховага вырашэньня чарговых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

У новым законе гэта роля сельскагаспадарчага падатку асабліва чотка і выразна вызначана.

Новы закон садзейнічае арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў

Аклад сельскагаспадарчага падатку з калгасаў вылічваецца **прапарцыянальна,** гэта значыць з кожнага рубля даходу бярэцца ўпэўна стаўка падатку, незалежна ад разьмеру валавога даходу (3—3,5 кап. для камун і сельскагаспадарчых арцеляй і 5 кап. для тазарыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі), прычым маламоцныя калгасы згодна пастаноў раённых падатковых камісій, поўнасьцю або часткова асьлабяюцца ад падатку.

Гэты парадак абкладаньня калгасаў у значнай меры садзейнічае **далейшаму ўзмацненьню і росту сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і магутнаму вытворчаму ўздыму шырокіх калгасных мас.**

Калгасы, якія цалкам і своячасова выканаюць пляны здачы (продажу) сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве і праўільна арганізуюць улік і справаздачнасьць, атрымліваюць 25 проц. скідкі з налічанай сумы падатку, прычым уся сума скідкі паступае ў распаяджэньне праўленьня калгасу **на пэм'яваньне лепшых брыгад і пасобных ударнікаў—калгасьнікаў.**

За далейшае пашырэньне пасеўных плошчаў і павялічэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі

Як у калгасах, так і ў аднаасобных працоўных сялянскіх гаспадарках увесь прырост пасеву на цаліне, або закінутых плошчах цалкам асьлабяецца ад абкладаньня сельскагаспадарчым падаткам.

Гэта ільгота, такім чынам, павінна садзейнічаць увядзеньню ў эксплёатацыю новых, неасвоеных вучасткаў зямлі, таму што асьлабяецца толькі прырост пасеву па цаліне і такім чынам тыя калгасы, або аднаасобныя працоўныя гаспадаркі, якія асвояць пэўную колькасьць гектараў на цаліне, але адначасова зьменшаць на такую-ж колькасьць гектараў пасеў на стара пахаці, трацяць права на ільготы і ўся пасеўная плошча ў гэтага выпадку будзе падлягаць абкладаньню. Гэта эрэзумела і правільна, таму, што ў гэтым выпадку фактычна ніякага павялічэньня пасеўнай плошчы ня будзе.

Вырашыць мясную праблему

Жывёла ўсіх відаў у калгасах, падаткамі не абкладаецца. У тых калгасах, дзе на падставе дагаворэў з адпаведнымі калгаснымі цэнтрамі існуюць таварныя фэрмы, ад сельска-гаспадарчага падатку асьлабяюцца як увесь даход ад гэтых фэрм, так і ўся каштоўнасьць кармоў, якія калгас перадае фэрме, або плошча кармовых траў, замацаваная за гэтай фэрмай.

Даход ад плошчаў, занятых сеянымі травамі і кармовымі кораніплодамі прыроўніваецца да даходу ад зярнёвых культур у тых-жа калгасах, а плошчы, занятыя насеньнікамі траў і кармовых кораніплодаў цалкам асьлабяюцца ад абкладаньня.

Уся жывёла, якая належыць калгасьнікам, цалкам асьлабяецца ад абкладаньня сельскагаспадарчым падаткам, а таксама асьлабяецца ад падатку **увесь прырост** супроць 1931 г. пагалоўя кароў, быкоў і авечак у аднаасобных працоўных гаспадарках, прычым у гэтых-жа гаспадарках асьлабяюцца ад абкладаньня і сьвіньні.

Новы закон таксама ўздыме рост сыравінай базы для лёгкай прамысловасьці і павялічыць прамысловыя таварныя фонды. Пасевы цукроўных буракоў, увесь прырост пасеўных плошчаў пад ільном—даўгунцом і канопляміі, усе пасевы ільна-даўгунца і канапель на ўноў асвоеных землях, а таксама **ўсе пасевы канапель у полі** ў калгасах і працоўных аднаасобных сялянскіх гаспадарках асьлабяюцца ад абкладаньня; даходы ад канапель і ільна пры абкладаньні прыроўніваюцца да паловы даходу ад зярнёвых культур, а таксама прадстаўляецца рад ільгот па іншых тэхнічных культурах.

Закон аб сельскагаспадарчым падатку садзейнічае калгасам, калгасьнікам і працоўным аднаасобным сялянам у справе разгортваньня гандлю прадуктамі сваёй сельскагаспадарчай вытворчасьці, паляпшэньню снабжэньня і ўцягненьню ў тавараварот новых дадатковых рэсурсаў. Даходы калгасаў і калгасьнікаў ад продажу на рынку прадуктаў сваёй сельскагаспадарчай вытворчасьці не абкладаюцца адзіным сельскагаспадарчым падаткам. Даходы працоўных аднаасобных гаспадарак ад продажу на рынку прадуктаў сваёй сельскагаспадарчай вытворчасьці пры цягваюцца да абкладаньня ў разьмеры не перавышаючым 30 процантаў астатняга абкладаемага даходу гаспадаркі (ад сельскай гаспадаркі і незем ляробчых заработкаў), а ў тых выпадках, калі аднаасобнік рэалізуе сваю прадукцыю праз калгасны ларок, або калгасны базар, рыначныя даходы цалкам асьлабяюцца ад абкладаньня.

Згодна закону прадстаўляецца рад ільгот па абкладаньні сельскагаспадарчым падаткам калгасьнікам і працоўным аднаасобным кампанентам, якія атрымліваюць даходы ад працы на прадпрыемствах і ў іншых галінах гарамадзянскага сэктару. Зусім асьлабяюцца ад падатку гаспадаркі асоб, якія закантрактаваліся ня менш, чым на год на працу ў вугальнай прамысловасьці; цалкам асьлабяюцца ад абкладаньня сельскагаспадаркам заработкі, атрыманыя на лесазагатоўках, лесасплаве і торфараспрацоўках. Калі адыходнік—аднаасобнік кантрактуецца на работу ў дзяржаўнай прамысловасьці, на транспарце, будаўніцтве, дык атрымліваемы на гэтых работах даход улічваецца да абкладаньня сельскагаспадарчым падаткам у палавінным разьмеры, супроць разьмеру, які вызначан законам для гэтых заработкаў.

Побач з пералічанымі ільготамі маламоцныя калгасьнікі і працоўныя ад наасобныя гаспадаркі, згодна пастаноў падатковых камісій, могуць быць цалкам, або часткова асьлабанены ад падатку, апрача таго для калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў захаваны яшчэ цілы рад ільгот, якія існавалі ў 1931 годзе.

Кожны калгасьнік і працоўны аднаасобнік павінен ведаць свае правы

У руках партыі наша падатковая палітыка, зьяўляючыся адным з важнейшых вагароў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, адначасова зьяўляецца і ня менш важным сродкам клясавага ўзьдзеяньня на капіталістычныя элемэнты. Таму ў законе аб сельскагаспадарчым падатку на 1932 г., побач з падкрэсьліваньнем недапушчальнасьці абкладаньня ў індывідуальным парадку серадняцкіх гаспадарак, прадугледжана рашучы патрабаваньні поўнага выяўленьня і абкладаньня ў індывідуальным парадку сапраўдных кулацкіх гаспадарак.

Усякім апартуністычным разважаньням аб тым, што кулака ўжо няма і ў індывідуальным парадку абкладваць некага, так і спробам прыцягнуць да індывідуальнага абкладаньня і прыпісаць да ліку кулакоў серадняка, павінен быць дадзены рашучы адпор.

Закон аб сельскагаспадарчым падатку неабходна давесьці да кожнага калгасу, да кожнага калгасьніка, да кожнага працоўнага аднаасобніка.

Неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу па тлумачэньні новага закону, неабходна дабіцца такога становішча, каб кожны калгасьнік, кожны працоўны аднаасобнік ведаў ня толькі свае абавязкі, але і свае правы, каб кожны калгасьнік, кожны працоўны аднаасобнік зусім яскрава зразумеў сутнасьць закону і яго аналізарчейшае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Праязьдзеньне растлумачальнай работы па новым законе аб сельскагаспадарчым падатку абавязкова павінна супалучацца з растлумачэньнем і іншых ня менш важнага гаспадарча-палітычнага значэньня апошніх мерапрыемстваў партыі і ўраду (аб збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках, гандлі прадуктамі сельска-гаспадарчай вытворчасьці).

Хутчэйшае праязьдзеньне масавай работы, давядзеньне да кожнага калгасьніка і аднаасобніка ўсіх пералічаных мерапрыемстваў партыі і ўраду, зразуменьне кожным калгасьнікам і аднаасобнікам таго, што ўсе гэтыя мерапрыемствы непасрэдна і цалкам вынікаюць з генэральнай лініі партыі—па рука далейшага магутнага вытворчага ўздыму і хутчэйшага вырашэньня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

На Магнітабудзе



Работы па пабудове 2-й чаргі Магнітабуду ідуць поўным ходам. Наближаецца да канца пабудова коксавай батарэі № 5. Кадры ІТР і будаўнікоў пераключаны на батарэі № 6.

Хутка рухаецца пабудова мартэнаўскіх пячэй.

Рабочыя пракатнага цэху абяцаюць скончыць мантаж 2-х станаў і 1-га блюмінгу да 1-га-XI—32 г. замест 1-X.

НА ЗДЫМКУ. Агульны від мартэнаўскага цэху.

У СНКБ

Савет Народных Камісараў зацьвердзіў плян загатовак лома-металу на 1932 г. чорных і каляровых.

Усе ведамствы і прадпрыемствы сьцісваемы ў лом металь павінны здаць трэсту «Мэталлом».

Прапанована Беларускаму Адзяленьню Трактарацэнтру, Белкалгасцентру разам з саўгаснымі аб'яднаньнямі і трэстамі прадстаўляць на дагаворных началах трэсту «Мэталлом» маючыйся ў іх распараджэньні гужавы і аўтамабільны транспарт для вывазкі мэталя-лому.

Для складаньня заключных справаздач па пасеву і правядзеньня агракультурных мерапрыемстваў Савет Народных Камісараў прапанаваў РВК і гарсаветам узяць пад асобны нагляд правядзеньне ўсёй работы па складаньню заключных справаздач па пасеву.

Устаноўлены наступныя тэрміны для складаньня і прадстаўленьня заключных справаздач па пасеву і чаканага ўраджаю:

а) саўгасы і іншыя гаспадарчыя ўстановы і арганізацыі і калгасы—не пазьней 15 чэрвеня г. г.;

б) упаўнаважаныя сельсаветаў па паселішчам—не пазьней 16 чэрвеня;

в) сельсаветы—не пазьней 20 чэрвеня;

г) райземаддзелы, саўгастрэсты, саўгасаб'яднаньні, Белкалгасцэнтр па спэцыяльным цэнтрам і Беларадзіленьне Трактарацэнтру—не пазьней 25 чэрвеня.

НК земляробства папярэднія вынікі не пазьней 30 чэрвеня, а канчатковыя зьвесткі—не пазьней 5 ліпеня.

Кіраўніцтва народна-гаспадарчага вучоту павінна забясьпечыць належную кансультацыю і практычную дапамогу органам НК Земляроўства пры правядзеньні гэтай работы.

Зламаць стаўку на самацёк у выкананьні плянаў кантрактацыі

ДОШКА ГОНАРУ

перадавікоў кантрактацыі тэхкультур

1. Лёзьненскі	раён, які плян па кантрактацыі валакна выканаў					на 114,8	проц.
2. Касьцюковіцкі	»	»	»	»	»	104,1	»
3. Сураскі	»	»	»	»	»	108,4	»
4. Шклоўскі	»	»	»	»	»	100	»

Дабіцца выкананьня плянаў

Зводка аб ходзе кантрактацыі тэхкультур па раёнах БССР на 20 мая паказвае на вінна прыкласьць увагу ўсіх партыйных, савецкіх, загатоўчых і зямельна-калгасных арганізацый. Яе лічбы сыгналізуюць аб вялікім прарыве на вучастку кантрактацыі тэхкультур.

Па БССР закантрактавана толькі 274,958 цнт. лёнавалакна, што складае 80,9 проц. у адносінах да пляну. Па пяньцы рэспубліканскі плян выкананы на 77,1 проц., па лёнасемі на 80,3 проц. і па канаплі на 73,1 проц.

Такое становішча мы маем у самы разгар пасеўнай кампаніі. Гэта прымушае біць трывогу.

У чым жа прычына гэтага прарыву? Прычына прарыву на фронце кантрактацыі хаваецца перш за ўсё ў правапартыністычнай стаўцы на самацёк па выкананьні гэтай работы з боку цэлага раду раённых кіруючых арганізацый.

Возьмем для прыкладу Старадароскі раён, аб якім мы сёньня зьмяшчаем матар'ялы. Старадароскі раён плян кантрактацыі па розных культурах у сярэднім выканаў на 40—50 проц. Гэткае становішча ходу кантрактацыі па раёне тлумачыцца тым, што раённыя кіруючыя арганізацыі паклаліся на самацёк. Справа ў гэтым раёне дайшла да таго, што цэлы рад сельсаветаў яшчэ нават не прыступілі да правядзеньня кантрактацыі.

Падобнае становішча мы маем і на цэлым радзе іншых раёнаў.

Сёньня мы заносім на чорную дошку Глускі, Петрыкаўскі, Старадароскі, Кармянскі і Бярэзінскі раёны, якія плян кантрактацыі тэхкультур выканалі ад 0 да 20 проц. Мы патрабуем ад гэтых раёнаў рашучага павароту да справы кантрактацыі. Усякія спасылкі на чарговасьць кампаніі ня могуць улічваціца. Партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі гэтых раёнаў ударнай і напружанай работай па ліквідацыі прарываў у кантрактацыі павінны дабіцца таго, каб яны былі зьвяты з чорнай дошкі. Усе аб'ектыўныя магчымасьці для перамогі ёсьць. У руках партыйных, савецкіх, загатоўчых і зямельна-калгасных арганізацый ёсьць такія магутныя вагары ўздыму актыўнасьці мас і павышэньня тэмпаў кантрактацыі, як апошнія пастановы партыі і ўраду аб загатоўках.

Ход кантрактацыі тэхкультур па БССР паводле даных на 20 мая

ЛЁНАВАЛАКНО: усяго па БССР закантрактавана 274,958 цнт. лёнавалакна—плян выкананы на 80,9 проц., у тым ліку калгасы свой плян выканалі на 90,1 проц., аднаасобніні на 57,5 проц. Сыстэма Трактарацэнтру плян выканала на 100 проц., Белзагатлён—на 73,9 проц., заводы Белільнатрэсту—на 77,6 проц.,

ПЯНЬКА: па БССР закантрактавана пяньні—28,444 цнт., што складае 77,1 проц. пляну. У тым ліку, калгасамі закантрактавана 82,3 проц., аднаасобнікамі—52,5 пр., Трактарацэнтрам—79,4 проц., Белзаготлёнам—70,3 проц., Беллёнатрэстам 71 проц.

ЛЁНАСЕМЯ: па БССР закантрактавана 80,3 проц. пляну па лёнасемі. У тым ліку па калгасах—85 проц., па аднаасобным сэктары—66,8 проц., па сыстэме Трактарацэнтру—103,9 проц., па Белзагатлёне—73 проц.

КАНАПЛЯ: усяго па БССР закантрактавана 22,844 цнт., або 73,1 пр. пляну. У тым ліку калгасамі—84,2 проц., аднаасобнікамі—59,9 проц., Трактарацэнтрам—91,5 проц., Белзагатлёнам—74,3 проц., заводамі Беллёна трэсту—63,2 проц

ЧОРНАЯ ДОШКА

раёнаў, якія зрываюць кантрактацыю лёну

1. Глускі	раён	плян	кантрактацыі	лёну	выканаў	на 0,0	проц.
2. Петрыкаўскі	»	»	»	»	»	5,8	»
3. Старадароскі	»	»	»	»	»	5,6	»
4. Кармянскі	»	»	»	»	»	17,0	»
5. Бярэзінскі	»	»	»	»	»	20,8	»

У палоне апартуністычнай стаўкі на самацёк

БАРЫСАЎ. (Наш. кар.) Барысаўскія кантрактацыйныя арганізацыі—Загатлён, райсаюз, загатзярно, не вядуць амаль ніякай работы па кантрактацыі. У выніку гэтага пляны кантрактацыі выкананы зусім у нязначнай колькасьці. На сёньняшні дзень па збожжавых культурах закантрактавана 39 проц. пляну, па бульбе—66 проц., па лёнавалакне 54,1 проц., па лёнанасеньні—48,3 проц., па пяньцы—54 проц., па канаплях—30 проц.

Замест вядзеньня сыстаматычнай работы і штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва, замест мабілізацыі ўвагі партыйных і савецкіх арганізацый на справу кантрактацыі, кантрактацыйныя арганізацыі займаюцца ачкаўціцельствам. Так, райсаюз сыстаматычна дае зводкі, па якіх можна зрабіць вывад, што з кантрактацыяй абстаіць усё добра. На 10 мая райсаюзам дана зводка, што плян кантрактацыі бульбы выкананы на 86,3 проц. Пасьля праверкі дагавораў аказалася, што ўсяго на 46 проц.

Загатчык райзагатзярно тав. Саяцэвіч, таксама займаецца ачкаўціцельствам, даючы ўвесь час павялічаныя зьвесткі і ўпэўніваючы, што ў яго ёсьць шмат нааформленых дагавораў. Але як раз апошнія сьведчаць аб бязьдзейнасьці самацёку ў рабоце Загатзярно.

Таксама зусім дрэнна вядзе работу па кантрактацыі Загатлён. Работа гэтай арганізацыі павінна быць пастаўлена асабліва чотка, паколькі ўжо павінна быць пачата падрыхтоўчая работа да загатовак тэхкультур.

Усе гэтыя факты яскрава сьведчаць аб тым, што ў Барысаўскім раёне справа кантрактацыі яўна недаацэньваецца. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны ў бліжэйшы час дабіцца таго, каб работу па кантрактацыі паставіць на ўдарныя рэйкі з тым, каб яна была закончана ў бліжэйшыя дні.

С.

Манцёры праводзяць тэлефон у калгасе «Ясная раніца» Старобінскага раёну.

В. Шчарбакоў

Навуковыя кадры БССР у другой пяцігодцы*)

Мы адзначылі цэлы рад недахопаў у падрыхтоўцы маладых навуковых работнікаў у нашых установах. Мы аналізуючы цяперашні склад навуковых работнікаў БССР, прыйшлі да заключэньня, што ён яшчэ не задавальняе нас ні з пункту гледжаньня якасьці, ні ў адносінах свайго партыйнага, сацыяльнага і нацыянальнага складу. І ў сэнсе сваёй навуковай кваліфікацыі цяперашні склад навуковых работнікаў далёка яшчэ не стаіць на належнай вышыні.

І ўсё-ж, ня гледзячы на ўсе гэтыя недахопы ў складзе нашых навуковых работнікаў і ў сыстэме іх падрыхтоўкі, мы ня можам ня прызнаць сур'ёзнейшых дасягненьняў і ў гэтай галіне. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы дабіліся вялікіх перамог і на фронце навукі. Бо фактычна ў Беларусі да Кастрычніцкай рэвалюцыі мы ня мелі навуковых кадраў. Паўтарастысячная армія навуковых работнікаў падрыхтавана намі фактычна занова ў пасьлякастрычніцкі пэрыяд. Сярод гэтай колькасьці работнікаў навуковага вучастку, мы маем ня мала кваліфікаванейшых, каштоўнейшых работнікаў, якія абагачваюць пралетарскую навуку новымі данымі, сваімі адкрыцьцямі і працамі. Асабліва вялікія рэзультаты ў галіне павялічэньня кадраў навуковых работнікаў і прыцягненьня іх да вырашэньня важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва мы маем за апошнія гады, за першую пяцігодку. І гэта ня гледзячы на тое, што нам у гэтай галіне, у галіне падрыхтоўкі навуковых кадраў ня мала нашкодзілі беларускія контрэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты. Яны шкодзілі, пакуль ня былі выкрыты, як па лініі падбору саміх работнікаў у сэнсе іх сацыяльнага твару і адданасьці савецкай уладзе, так і ў сэнсе разьмеркаваньня навуковых сіл па паасобных галінах нашага будаўніцтва. Вядома, напрыклад, што нацыянал-дэмакраты стараліся ўсяляк тармазіць падбор навуковых работнікаў па такіх галінах, як тэхніка, геалёгія, хімія і г. д. Яны ўсю сваю ўвагу згрупоўвалі на падрыхтоўцы навуковых кадраў у галіне, галоўным чынам, мэдыцыны, вэтэрынарыі, бібліятэчнай і музэйнай справы, мастацказнаўства, сельскай гаспадаркі. Прычым гэтая падрыхтоўка вялася ў духу патрабаваньняў Прышчэпава, Баліцкага. Яны арыентаваліся на кулацкую «культурную» гаспадарку. Нацдэмы шкодзілі нам і ў галіне плянаваньня, у галіне падрыхтоўкі навуковых кадраў у першай пяцігодцы. Складзеная Некрашэвічам і Баліцкім першая пяцігодка навуковых кадраў БССР прадугледжвала рост навуковых работнікаў да 1933 году каля 700 чалавек. А мы ўжо ў гэтым годзе маем 1.500 навуковых работнікаў. Мы адкінулі гэтую шкодніцкую пяцігодку нацдэмаў. Па праекце тых-жа нацдэмаў меркавалася рыхтаваць наступную колькасьць асьпірантаў па гадох: 1928-29 г.—110 чал., 29-30 г.—130 чал., 30-31 г.—150 ч., 31-32 г.—170 чал., 32-33 г.—190 чал. Мы-ж фактычна маем асьпірантаў: у 1928 г.—140 чал., у 1930—260 чал., і ў 1932—396 асьпірантаў. У канцы бягучага году ў сувязі з новым прыёмам мы будзем мець ня менш 700 асьпірантаў.

Нашым вялізарным недахопам у галіне падбору навуковых работнікаў і падрыхтоўкі асьпірантаў у першую пяцігодку зьявілася тое, што мы фактычна ня мелі бальшавіцкай пяцігодкі навуковых кадраў. Тут ня было строга-плянавай работы і сыстэмы, а быў самацёк. І нашым вялізарнейшым дасягненьнем у галіне разгортваньня навуковай работы ў другой пяцігодцы будзе зьяўляцца апроч усяго іншага наяўнасьць пляну падрыхтоўкі навуковых кадраў для гэтай пяцігодкі. Тое, што мы зараз ужо займаемся гэтым пытаньнем, тое, што ім будзе займацца канфэрэнцыя навукова-дасьледчых устаноў—адно гэта мае для нас важнейшае значэньне. Ясна, што да намечаных тэрмінаў мы будзем мець строга прадуманы плян падрыхтоўкі навуковых кадраў у другую пяцігодку.

З якіх-жа частак гэты плян павінен складацца? Які рост навуковых кадраў, па якіх спэцыяльнасьцях, якой якасьці гэтыя кадры мы будзем мець? Да складаньня другой пяцігодкі навуковых кадраў БССР мы павінны падыйсьці з пункту гледжаньня тых дырэктыў нашай партыі і савецкай улады па складаньні другой пяцігодкі народнай гаспадаркі і культуры БССР, якія мы маем, мы павінны падыйсьці да яго з пункту гледжаньня тых задач, якія высунуты XVII ўсесаюзнай партканфэрэнцыяй. Складаючы гэтую другую пяцігодку мы павінны ўлічыць перш за ўсё вядучыя галіны народнай гаспадаркі і тыя важнейшыя задачы, якія высоўваюцца ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва нашай краіны ў цэлым у другую пяцігодку, улічыць рост навуковых кадраў у першую пяцігодку і разгортваньне сеткі ВТНУ і навукова-дасьледчых устаноў у другую пяцігодку. У дырэктывах ЦК КП(б)Б і СНК БССР па складаньні другой пяцігодкі адзначаецца што вядучымі галінамі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ў нас намячаюцца такія галіны, як: энэргетыка, торф, хімія, мэталёапрацоўчая прамысловасьць, будаўнічыя матар'ялы, жывёлагадоўля, тэхнічныя культуры і пераапрацоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў. На гэтыя галіны мы павінны будзем кінуць максымальную колькасьць навуковых сіл у другую пяцігодку. З іншых галін нашага гаспадарчага будаўніцтва выпукляюцца: карэнная рэканструкцыя нашага транспарту ўсіх відаў яго і асабліва воднага, разгортваньне камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва і савецкі гандаль. У сувязі з пастаўленай асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі—канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, пароджаючых клясавую розьніцу і эксплёатацыю і перамога перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей,—ня трацяць свайго значэньня і сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны, праблемы культурнай рэвалюцыі, а ў нашых умовах і праблемы, зьвязаныя з росквітам нацыянальнай пралетарскай культуры. Усе гэтыя галіны нашага будаўніцтва мы павінны ўлічыць пры складаньні другой пяцігодкі пляну навуковых кадраў. Мы павінны забясьпечыць навуковымі кадрамі разгортваньне навукова-дасьледчай работы ў другую пяцігодку ва ўсіх гэтых галінах. Мы павінны таксама мець навуковыя кадры для кадраў, для работы ў ВНУ. Апроч таго, маючы на ўвазе ўмацаваньне нашых раёнаў і разгортваньне імі вялікай гаспадарчай і культурнай работы, нам неабходна ў другую пяцігодку забясьпечыць хоць-бы мінімальнай колькасьцю навуковых работнікаў раённыя цэнтры.

Калі ўлічыць усе гэтыя патрэбы ў навуковых кадрах, калі прыняць пад увагу рост навуковых кадраў за першую пяцігодку, амаль у 3 разы, дык мы павінны будзем мець па нашых далёка ня поўных падліках, да 1937 году 4.500—5.000 навуковых работнікаў у БССР. Пастараемся абгрунтаваць гэтую лічбу адпаведнымі данымі. У нашых 32 ВНУ ў сучасны момант працуе каля 1.000 выкладчыкаў. Сярод іх ёсьць каля 40 проц. сумяшчэнчых. Нам неабходна дабіцца замацаваньня асноўных выкладніцкіх сіл зь ВНУ. Калі прыняць пад увагу, што рост студэнцтва ў нас, незалежна ад росту сеткі ВНУ, павялічыцца ў другую пяцігодку мінімум у 3 разы, мы павінны будзем мець у вышэйшых школах мінімум 2.000 навуковых работнікаў. Кожны раённы цэнтр мы павінны будзем забясьпечыць у другую пяцігодку групай навуковых работнікаў і перш за ўсё эканамістамі, па пытаньнях культуры і краязнаўстве, мінімум па 5 чал. у кожны раён. На гэтую справу, значыцца, нам неабходна да 400 навуковых работнікаў. Апроч існуючых ужо зараз 19 рэспубліканскіх навукова-дасьледчых інстытутаў, 6 філіялаў саюзных інстытутаў, 13 дасьледчых станцый, Акадэміі Навук і розных іншых устаноў, якія вядуць навуковую работу, нам неабходна будзе стварыць цэлы рад новых навукова-дасьледчых устаноў і перш за ўсё адкрыць спэцыяльныя інстытуты па энэргетыцы, электрыфікацыі, машынабудаўніцтве, будаўнічых матар'ялах, савецкім гандлі, камунальным будаўніцтве, па пераапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі. Гэта ў першую чаргу. У кожным з гэтых інстытутаў павінна быць ад 60 да 100 навуковых работнікаў. Значыцца, на гэтыя новыя інстытуты неабходна мець да 500 навуковых работнікаў. У існуючых навуковых установах БССР працуе зараз 804 навуковых работнікі. У сярэднім гэта прыходзіцца, лічачы Акадэмію, дзе ёсьць сваіх 12 інстытутаў, 4 нацсэктары, за адну адзінку, 20 навуковых работнікаў на кожную навуковую ўстанову, а калі адкінуць Акадэмію, дык і таго менш—15 прыблізна чалавек. У некаторых навуковых установах зараз ёсьць нязначныя групы навуковых работнікаў і нават толькі па адным навуковым работніку. Напрыклад, у філіяле інстытуту сувязі знаходзіцца 1 работнік, станцыя па пчалярстве мае 1 чал., мікрабіялёгічны інстытут—4 чал. Неабходна лік навуковых работнікаў у існуючых установах павялічыць мінімум у 2-2½ разы, і давесьці агульную колькасьць іх з 804 чал. да 2.000 навуковых работнікаў. Такім чынам, мы, ня ўлічваючы патрэб гаспадарчых і плянавых арганізацый, павінны будзем мець у канцы другой пяцігодкі 4.900 навуковых работнікаў.

Паглядзім зараз, як нашы паасобныя навуковыя ўстановы мысляць сабе рост навуковых кадраў у другую пяцігодку. Рад з іх ужо займаліся гэтым пытаньнем і маюць свае намёткі пляну. Інстытут эканомікі БАН, напрыклад, мысьліць сабе павялічэньне навуковых работнікаў да 1937 году да 124 чалавек (у гэтую колькасьць уваходзяць 29 вучоных спэцыялістаў, 26 навуковых работнікаў 1 разраду, 30 чал. II-разраду і 39 асыстэнтаў. Да пачатку 1933 г. ён павінен мець 55 чалавек. За другую пяцігодку мы маем рост у 2 з паловай разы. Інстытут філёсофіі Акадэміі мысьліць сабе павялічэньне кадраў да 42 чал. у 1937 г. за раз ёсьць 19 чал., інстытут савецкага будаўніцтва ставіць сваёй задачай павялічыць кадры па сваёй лініі да 70 чал. замест 23 работнікаў у 1933 годзе. Інстытут літаратуры намячае рост з 21 чалавека да пачатку 1933 году да 47 чал. ў 1937 годзе. Латсэктар дае прырост з 3 чал. у гэтым годзе да 9 чал. у канцы другой пяцігодкі, літсэктар—з 2 чал. да 6 чалавек. Рост па лініі фізыка-тэхнічнага інстытуту намячаецца з 35 чал. у 1933 г. да 81 чал. у 1937 г. Інстытут біялёгіі ставіць сваёй задачай павялічыць кадры з 21 чал. у 1933 г. да 46 чал. у 1937 г.

Інстытут санітарна-гігіенічны пры Наркам ахове здароўя БССР намячае рост з 15 чал. у гэтым годзе да 62 чал. у 1937 г. Беларуская занальная станцыя лекавых і араматычных расьлін намячае рост з 32 чал. у 1933 г. да 108 чал. у канцы пяцігодкі. Беларуская занальная ільняная станцыя намячае рост з 45 раб. у 33 г. да 76 раб. у 37 г.

Па паасобных галінах навукі, найбольш закінутых у нас, нам прыдзецца мець значна большы рост навуковых кадраў. Асабліваю ўвагу нам прыдзецца зьвярнуць на такія галіны як эканоміка, тэхніка, хімія, агрохімія глебазнаўства, геалёгія, культура і пэдагогіка. Разам з пытаньнем аб колькасным росьце навуковых работнікаў у другую пяцігодку стаіць ня менш важнае пытаньне і аб якасьці іх, аб узьняцьці іх навуковай кваліфікацыі. Неабходна давесьці праслойку навуковых работнікаў з рабочых і калгасьнікаў ня менш, чым да 60 проц. Трэба таксама значна павысіць і партыйную частку іх. Пры наяўнасьці 60 проц. партыйцаў сярод асьпірантаў у сучасны момант, мы, маючы на ўвазе асьпірантуру як галоўную крыніцу папаўненьня радоў навуковых работнікаў, можам разьлічваць на ўзьняцьце партыйнай праслойкі сярод навуковых работнікаў у канцы другой пяцігодкі ня менш, чым на 50 проц. Неабходна таксама ўзьняць процант навуковых работнікаў з беларусоў, а таксама з нацменшасьцяў.

Асабліва павінна стаяць пытаньне аб павышэньні навуковай кваліфікацыі навуковых работнікаў. Ня можа заставацца такое палажэньне, калі за раз сярод навуковых работнікаў налічваецца каля 45 проц. такіх, якія яшчэ ня маюць сваіх друкаваных прац. Кожны з навуковых работнікаў, калі ён сапраўды хоча быць гэткім, павінен працаваць над тым ці іншым пытаньнем, не абмяжоўвацца толькі экспэрымэнтальнай ці выкладчыцкай работай, але павінен даваць і прадукцыю. Неабходна выпрацаваць цэлую сыстэму мерапрыемстваў па павышэньні якасьці нашых навуковых работнікаў, па ўзьняцьці іх навуковай кваліфікацыі, па праверцы іх работы ў галіне распрацоўкі тых ці іншых пытаньняў. Трэба зьвярнуць вялікую увагу на стварэньне брыгад для калектыўнай распрацоўкі адпаведных праблем, аказаньне дапамогі больш кваліфікаванымі навуковымі сіламі менш кваліфікаваным, на пасылку маладых навуковых работнікаў у працягляя навуковыя камандыроўкі. Асабліва стаіць пытаньне аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў у галіне марксэ-ленінскай мэтадалёгіі, аб ідэялёгічнай вытрыманасьці навуковых работнікаў. Мы намецілі вялізарнейшы рост навуковых кадраў у другую пяцігодку. Запытваемся, адкуль мы атрымаем гэтыя новыя кадры, якія тыя крыніцы адкуль мы будзем чэрпаць нашы навуковыя сілы. Мне здаецца, што такіх асноўных крыніц у нас ёсьць дзве: падрыхтоўка навуковых работнікаў праз асьпірантуру і вылучэньне. Мы павінны тут яшчэ раз падкрэсьліць, што ў першую пяцігодку мы яшчэ недастаткова разгарнулі работу па падрыхтоўцы навуковых сіл з асьпірантуры, што наяўнасьць у нас у сучасны момант 400 асьпірантаў вельмі мізэрная лічба з пункту гледжаньня патрабаваньняў на навуковых работнікаў. Таму неабходна ў другую пяцігодку прыйсьці разгарнуць работу па падрыхтоўцы асьпірантуры.

Нам неабходна мець у канцы другой пяцігодкі каля 5.000 навуковых работнікаў. Зараз мы маем 1.500. Асьпірантура дасьць нам праз год—два яшчэ 400 чал. Нехапаючых 3.000 чалавек мы павінны атрымаць занова. Прычым з гэтай колькасьці мы павінны ня менш 2.000—2.500 работнікаў падрыхтаваць з асьпірантаў. Гэта зусім ня значыцца, што мы будзем мець ў другую пяцігодку толькі такую колькасьць асьпірантаў. Бо нельга-ж забывацца аб тым, што з прынят

Рыхтаваць баявую сустрэчу асеньня-зімоваму грузапатоку

Посьпех выкананьня перавозачных плянаў забясьпечваецца чоткім і апэрацыйным партыйным кіраўніцтвам. Кожнае дэпо, кожны абменны пункт, кожны вучастак транспарту неадкладна ўключыць у баявую падрыхтоўку да перавозак

ДЭПО ЗМАГАЕЦЦА ЗА ПЯРШЫНСТВА

кожны дзень і кожную гадзіну мацаваць дасягнутыя посьпехі

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Адбыўся зьлёт ударнікаў вузла Жлобін, прысьвечаны падагульненьню вынікаў работы па другім Усесаюзным конкурсе спаркіх. У гэты дзень вопытам сваёй работы дзяліліся цягавікі, прыйшлі з зьнікамі сваёй работы рабочыя адзелаў шляху, сувязі, руху.

Лёйбы, якімі быў насычаны даклад начальніка дэпо тав. Галавачэнкі, яскрава адбіваюць шлях, па якім прайшлі за кароткі ў гэтак значны гэрмін конкурсу паравозьнікі, рабочыя дэпо. Павольнае ўключэньне ў конкурс, недастатковасьць кіраўніцтва ўзросшай актыўнасьцю, што заважалася ў пачатку, былі хутка зьпраўлены, трыкутнік дэпо ўзначаліў работу па конкурсе і пазбыў рабочых калектыў да аздараўленьня паравознае гаспадаркі, да наладжваньня ўсёй работы дэпо.

Фінш конкурсу—дакумант, паказаль ник перамогі. Брыгада Шатылы і Арлова-Арлоўскага (пар. 3523) атрымалі гонаровасьць лепшых на дарозе. Брыгады Відорчыка і Сенажэнскага (пар. 1885) заняли першае месца ва Усесаюзным конкурсе, атрымалі ганарое ле ня ЦК КП(б)Б. Брыгады Зялёнкі і Хохласа (пар. 1689) у другі раз атрымалі гонаровасьць лепшых у БССР, а таксама трэцюю прэмію на раённым конкурсе. Прэм'яваны па раённым конкурсе прамывачны цэх дэпо, дзяжурны на дэпо І. Зялёнка, дыспэтчар Бунін.

Мэханічна-такарны цэх дэпо ўзьняў на час конкурсу прадукцыйнасьць працы на 9,09 проц., зьнізіў сабекошт на 7,28 проц. Пры заданьні выдаткаваць на 100 паравоза-кілёмэтраў 0,42 гадз., цэх выдаткоўваў усяго 0,32 гадзін. Адпавелна сабекошт рабочай сілы замест 0,44 кап. складаў 0,33 кап. Цэх ня меў ніводнага парушэньня дысцыпліны, цэх працаваў ударна.

Не адстае цэх бягучага рамонту паравозаў. Рабочыя цэху ўзьвялі прадукцыйнасьць працы на 13,62 проц., зьнізілі сабекошт на 10,4 проц., пры заданьні выдатковаць 6.24 гадзін. на 100 паравозакілёмэтраў цэх выдаткоўваў 4,58 гадзін. Пры заданьні працаваць паравозаў на гарачай прамыўцы 10 гадзін выканана 4, у халоднай прамыўцы—замест 38 выканана 36 гадзін. Агульны прастой на прамыўцы замест 17 гадзін склаў 16,5.

Бальшавіцкія тэмпы работы, барацьба за якасьць рамонту аздараўляюць паравозны парк: пры заданьні ў 11,3 проц. хворых паравозаў дэпо за час конкурсу дасягло 10 проц., выкажучы гэтым самым дырэктыву ЦК КП(б)Б, стаўшы прыкладам для ўсіх дэпо БССР у справе аздараўленьня вагоннага парку паравозаў. Цэх за час конкурсу ажыў цалкам парушэньні дысцыпліны. Змагаючыся за пярэдавіцтва, падцягваючы адсталыя вузлы работы, цэх узьняў якасьць рамадзкай работы, у ім асабліва вылучыўся прафгрупа камсамольскай брыгады Падневіча. Яна прэм'яваная прафгрупаючам 800 руб., прафорг групы тав. Падневіч прэм'яваны індывідуальна ў 150 руб. Гэтая група—прыклад усім прафгрупам вузла.

Канальскі цэх ідноў поплеч з іншымі дохазе. Калі ўзьвялі працадукцыйнасьць працы на 12,3 проц., зьнізілі сабекошт на 9,6 проц., выдаткоўвалі на 100 паравозакілёмэтраў 0.24 гадз., замест задаваных 0.33.

Паравозьнікі, змагаючыся за выкананьне 12 умоў конкурсу, маючы на ліку лепшых ударнікаў, пераможца брыгадаў на фінішы, дасягнулі прадвыкуставнага прабегу ў 226 клм. пры заданьні ў 205. Карысная работа паравоза склала 12,62 тэхкм., пры заданьні 11,5. Спаравозы ў красавіку замацаваны па паравозах на 99,27 проц., па брыгадах на 99,7 проц. Паравозы ўсё лепш і лепш авалодваюць тэхнікай разумнага і ашчаднага апалываньня паравозаў: у сакавіку эканомія склала 1,35 проц., а ў красавіку 14,72 проц.

Склад паліва—зузкае месца вузла Жлобін. На склад паліва заўсёды скарджаліся паравозьнікі, склад паліва спачатку зрываў дасягненьні конкурсу, склад трымаў паравозы пад наборам паліва па 3—5 гадзін, яны ставалі пут доўгай чарадой.

Конкурс аздаравіў і склад, які пасьпяхова выходзіць з прарыву. За час конкурсу прастой паравозаў на складзе паліва зьнізіўся ў сярэднім на 15 хв. Правільная арганізацыя работы, чоткі графік падыходу паравозаў стварылі гэтую лічбу. Прадукцыйнасьць работы вугальшчыкаў узрасла на 10 проц., сабекошт зьніжаны на 5 проц. Прастой вагонаў пад выгрузкай вугалю зьніжаны да 3 гадз. 30 хв. На 100 проц. ліквідавалі рабочыя складу парушэньні працадысцыпліны. Загадчык складу тав Баравік за арганізацыю работы, зжываньне прарываў прэм'яваны дырэктарам даро гі месячным окладам.

Аздараўленьне паравознага парку пішло побач з барацьбой за здароны вагон. Вагонны цэх таксама за час конкурсу меў дасягненьні, ён таксама наблізіўся да ліквідацыі прарываў. Ён мае ўсе падставы замацоўваць свае перамогі, забясьпечыць асеньня-зімовыя перавозкі здаровым вагонным паркам. Брыгада Шутава за красавік пры заданьні ў 13179 вагонаў прапусьціла 22572 (151.3 проц.). Па віне бы гады ня было ніводнай адчэпкі вагонаў. Брыгада Пашкоўскага дасягнула ў красавіку 150,17 проц. прадукцыйнасьці працы (люты—104,25 проц., сакавік—124,18 проц.).

Здароваму паравозу, здароваму вагону патрэбны здаровы шлях. Гэта ўсьвядомілі рабочыя 1 і 2 аколодкаў шляху. Яны ўзьняслі прадукцыйнасьць работы на 155 проц., зьнізілі сабекошт на 10 проц. Рабочыя аколодкаў зьмяняюць 28-30 шпал на аднаго чалавека пры заданьні ў 10-12.

Палепшана работа і сувязі: на 103 проц. выканана заданьне тэлеграфам, значна зьнижаны сабекошт работы.

Гэтыя дасягненьні—вынік ударнай работы. На зьлёце чытаўся доўгі сьпіс лепшых ударнікаў, якія былі прэм'яваны: сьлесары Канапляньнікаў, Радзевіч, Кісялёў, Юхнезіч; такары Блізьцюк, Саваськюк, Грахоўскі; кацельшчыкі Путач, Бачароў; кавалі Кузьняцоў, Зайцаў; паравозьнікі брыгады Метэлля, Драздова і Марозава, Тамкова і Рацэвіча.

Зьмешча - сустрэчнае ўлічваньне, барацьба падрыхтоўка да асеньня-зімовых перавозак—вось праграма далейшай барацьбы

Пуцёўка на пераможны шлях атрымана. Яе трэба трымаць моцна, яе трэба несьці з гонарам, заданьне гэтай пуцёўкі трэба выканаць работай, адзначанай тэмпамі другога конкурсу, на аснове ажыцьцяўленьня гістарычных паказаньняў правадыра партыі тав. Сталіна.

Ташын.

ДЭЛЕГАТ ЗЬЛЁТУ ТАВ. ЦЫКУНОЎ-СЬЛЁСАР ЧЫРВОНАШТАНДАРТНАГА ГАСПРАЗЬЛІКОКАГА ЦЭХУ АБОТОЧКІ ДЭПО-ВІЦЕБСК.

Дэлегат зьлёту тав. Цыкуноў-сьлёсар чырвонаштандартнага гаспразьлікокага цэху абточкі дэпо-Віцебск.

Вадзіць цягнікі ў бясьпечнасьці

Ня гледзячы на досыць спрыяючыя ўмовы для работы, колькасьць здарэнь няў па 5 эксплёатацыйным раёне не зьмяншаецца а наадварот—павялічваецца.

Здарэньне на чыгунцы адно з жгіднейшых зьявішч, якое перашкаджае працаваць чотка і наносіць вялікія страты транспарту.

У чым прычыны гэтых здарэньняў?

Прычыны толькі ў тым, што работа па барацьбе са здарэньнямі ідзе самацёкам. Ня гледзячы на канкрэтныя дырэктывы НКШЗ па барацьбе са здарэньнямі, тэхнічныя работнікі раёну, лініі, мясцкому да гэтага часу праяўляюць нізкабайнасьць да пытаньняў бясьпечнасьці руху і адносяцца да гэтага па-стазёнску. Мясцкомы ня ведаюць, што робяць ячэйкі па барацьбе са здарэньнямі, бо яны не заслухоўваюць іх на вытворчых сходах.

У выніку невыкананьня правіл тэхнічнай эксплёатацыі 5 мая машыністы Скуратовіч і Злотнікаў, пам. маш. Рыбін і стрэлачнік Раманенка пасадзілі два паравозы. 7 мая машыніст Пяфюдовіч едучы ў Жлобін, наехаў на гідраўлічны кран.

11 мая цягнік № 821 быў адпраўлен з перавышаючай вагой, у выніку чаго паміж Менай і Нізкаўкай спыніўся ў шляху.

А рэвізоры—Баранчэнка і Каральчук, замест расьсьледваньня гэтых здарэнь няў, маруднічаць...

Факты гавораць аб тым, што неабходна безадкладна пераглядзець работу па барацьбе са здарэньнямі, зьнічыць ігнараваньне і коснасьць у пытаньнях бясьпечнасьці руху.

Лазоўскі.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП НА ТРАНСПАРЦЕ

Дэлегаты зьлёту выпрацоўваюць дагавор на сацспаборніцтва паміж дэпутацкімі групамі чыгунач ных дарог БССР.

У рабоце вызначыўся зрух

Гомельскі абменны пункт ня можа адставаць

За апошні час наглядаецца значнае палепшаньне ў рабоце Гомельскага абменнага пункту.

Мэтады сацыялістычнага спаборніцтва па зьменах рабочых паказалі лепшыя прыклады барацьбы за здаровы вагон. Калі ў лютым і сакавіку сума штрафаў Паўднёва-Заходніх чыгунак вызначалася ў сярэднім на вагон у 28 руб., дык у красавіку Гомельскі абменны пункт здаў вагонаў Паўднёва-Заходняй чыгункі на суму 30.132 р. 20 кап., што ў сярэднім дае на вагон 14 р. 73 к.

Тым часам ад Паўднёва-Заходніх чыгунак прынята вагонаў на суму 56.558 руб., што ў сярэднім дае на вагон 31 р. 09 к.

Але падзьнышэньня вынікі работы абменнага пункту яшчэ ні ў якім разе ня могуць задаволіць нас, бо пункт не скарыстаў яшчэ ўсе магчымасьці для поўнага аздараўленьня вагоннага парку для падрыхтоўкі да асеньня зімовых перавозак.

За правільную расстаноўку рабочай сілы

Абменны пункт знаходзіцца ў двох мясцох: на Гомель—сарт. і на Гомель-пас., што зьвязана з лішняй тратай сродкаў на рабочую сілу і падвозку матар'ялаў і запасных частак.

Правільная расстаноўка рабочае сілы па рамонце рухомага складу неарганізавана. Часта з прычыны гэтага затрымліваецца і значна павялічваецца сярэдняя сума штрафаў на вагоны, якія здаюцца Паўднёва-Заходнім чыгункам.

Зьнішчыць абязьлічку інструманту

Інструмант абменнага пункту абязьлічаны, нягледзячы на дабайныя адносіны да яго, частыя паломкі ўвайшлі ў сыстэму.

Тамбачкі (дынкраты), пастаўленыя з рамонту дэпо сартыровачнай, сталі праз меру цяжкаважкімі, бо за іх прымацавалі жалезныя плёты зялікага разьмеру. Колькі рабочыя не гаварылі ад міністрацыі, каб абрубіць плёты, але яны на гэта не рэагуе.

Па новай эпохе ЦК чыг начнікаў і НКШЗ на абменным пункце павінна быць уведзена з 1 красавіка новая сетка аплаты працы рабочых, сьлесараў і ўсяго тэхперсаналу. Аднак, аддзел эканомікі працы дэпо Гомель яшчэ не распрацаваў фэрму ўліку работ па новай сетцы. Сэктар-жа зарплаты райпрафсачу не зьвярнуў на гэта належнай увагі і ня прымусіў гаспадарнікаў хутчэй правесьці ў жыцьцё новую тарыфную сетку па абменным пункце.

Лепшыя вопыты работы Ігнаруюцца

У мэтах увядзеньня зьдзельшчыны арганізавана спэцыяльная вопытная брыгада з 5 камсамольцаў, якія пераведзены на зьдзельшчыну. Але яе працай тэхагенты ня кіруюць. Яны ня толькі не вывучаюць мэтадаў работы гэтай брыгады, але і не выдаюць ярлыкоў для выкананьня работ.

Утылізацыйную брыгаду—на гаспразьлік

Утылізацыйная брыгада працуе нездавальняюча, бо ў ёй няма сталага штату і ня ўведзена сыстэма доўгі сьпіс спэцыялізацыі працы. Брыгада не пераведзена на гаспразьлік, у выніку чаго прадукцыйнасьць працы ў гэтай брыгадзе не дае дастатковага эфэкту.

Дрэнная якасьць запасных частак, якія загатаўляюцца, робіць уплыў на якасьць рамонту.

Пры рамонце таварных вагонаў на абменным пункце з прычыны недахопу запасных частак даводзіцца раманаваць старую запасную частку і стаўць яе на месца.

У мэтах аздараўленьня вагонаў і зьмяншэньня штрафной прыплаты трэба для абслугоўваньня абменнага пункту вылучыць сталага каваля.

Каб палепшыць і паскорыць работу сьлесароў рухавога складу абменнага пункту і лепш арганізаваць падвоз матар'ялаў і запасных частак трэба арганізаваць сталую гаспадарчую брыгаду і забясьпечыць яе маторнай дрэзінай для падвозу запасных частак па абмежаных работ.

Уезьняць працоўную дысцыпліну

Працоўная дысцыпліна як па дэпо сарт., так і па абменным пункце далёка яшчэ нездавальняючая. Есьць зьпадкі спазьненьня на работу, уход з работы на 20 мінут да гудка.

Культурнае абслугоўваньне рабочых абменнага пункту таксама не на вышыні. Памяшканьне на Гомель-гасп. магчыма абсталяваць пад чырвоны куток, стварыць там бібліятэку, правесьці радыё. На гэта неабходна зьвярнуць увагу культсэктару райпрафсачу і ўзьдзей нічаць на гаспадарнікаў, каб яны абсталявалі і адкрылі чырвоны куток на Гомель—гаспадарчы.

***

Аздараўленьне вагоннага парку ў сувязі з асеньня-зімовымі перавозкамі на бывае зараз вялізарнае значэньне. У гэтай галіне асноўная адказнасьць ляжыць на абменных пунктах.

Гомельскі абменны пункт бясспрэчна пачаў вылазіць з глыбокага прарыву. Для таго, каб пункт сапраўды стаў узорнай адзінкай, неабходна каб усе яго арганізацыі ўзяліся па-бальшавіцку за зьнішчэньне паказаных недахопаў у яго рабоце, на сапраўднае ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў таў. Сталіна, за дасягненьне на пункце жалезнай працоўнай дысцыпліны.

Адначасова патрэбна, каб усе сэктары райпрафсачу сталі тварам да абменнага пункту і змагаліся за канкрэтную дапамогу ва ўсіх галінах яго работы.

Брыгада:
Матузаў, Жукаў, Кянько, Кунцэвіч Рачко.

Дэпутацкая група перабудоўваецца

Задачы асеньня-зімовых перавозак—задачы дэпутацкіх груп і транспартных сэкцый

Барысаў. (Наш кар.). У апошні час значна ажывіла сваю работу дэпутацкая група ст. Барысаў. У час падрыхтоўкі да чыгуначнай эстафэты і асеньня-зімовых перавозак члены пленуму дэпутацкай групы разьбіліся па брыгадах для праверкі работы асобных вучасткаў вузла, прыцягнуўшы ў гэтыя брыгады рабкораў і рабочых актыў.

ДЭЛЕГАТ ЗЬЛЁТУ ТАВ. РАЖАНСКІ-МАШЫНІСТ ДЭПО-ОРША. АКТЫЎНЫ ДЭПУТАТ ГАРАДСКОГА САВЕТУ.

Па ініцыятыве дэпутацкай групы адкрыта — грамадзкая білетная каса і другое касавае важно пры станцыі, што значна палепшыла абслугоўваньне пасажыраў. Па ініцыятыве дэпутацкай групы многа таксама чаго зроблена для палепшаньня грамадзкага харчаваньня. У сталоўцы пастаўлены асобныя сталы ўдарнікоў. Арганізавана паблюдная сыстэма.

Дэпутацкая група ст. Барысаў узяла на сябе рад абавязацельстваў па ліквідацыі недахопаў.

Па службе эксплёатацыі яна абавязалася:

дабіцца 100 процантнага адпраўленьня цягнікоў па раскладзе і іх спэцыялізацыі. Дабіцца 100 процантнага выкананьня адправак цягнікоў маршрутамі, скараціць прастоі вагонаў пад выгрузкай на 1 гадзіну, скараціць прастоі вагонаў супроць даных вымернікаў па трамфінпляне на 1 гадз., павялічыць манэўровы каэфіцыент супроць даных вымернікаў на 15 проц., правесьці 100 процантнае прымацаваньне зьмен, поўны перавод усіх зьвеньняў работы на гаспадарчы разьлік.

Па паравозах:

дабіцца 20 процантнай эканоміі паліва і выканаць на 100 проц. узятыя абавязацельствы па гаспадарчым разьліку.

Разгарнуць работу станковых і цэхавых вытворчых нарад 1 раз у дэкаду. Дабіцца асьвятленьня праз насьценгазэту ўсіх недахопаў і дасягненьняў у рабоце.

Дабіцца 100 процантнага выкарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, шляхам пераробкі нягодных частак вагонаў у годныя (балкі, гайкі, сьцяжкі і г. д.).

Забясьпечыць сваячасова запаснымі часткамі рамонт вагонаў шляхам сваячасовага патрабаваньня ад снабжаючых арганізацый.

Па шляху:

скончыць 100 процантны рамонт чыгуначнага шляху, выканаць заданьне па зьмене шпал на 100 проц., зьмене пераводных брусоў на 110 проц.

Палепшыць санітарнае становішча шляху, рабіць штодзённую ўборку і вывозку сьмецьця.

У галіне палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў:

за летні перыяд правесьці рамонт кватэр рабочых, весьці растлумачальную работу па поўным укараненьні ў кватэрах рабочых сан-мінімуму.

Прывесьці крамы і сталоўкі ТСТ у добрае санітарна-гігіенічнае становішча, арганізаваўшы непаслабны кантроль у галіне работы мясцовага аддзяленьня ТСТ па выкананьні ім рашэньняў партыі аб савецкім гандлі.

Устанавіць нагляд і практычна дапамагчы засеву прыгараднага гароду. Палепшыць культабслугоўваньне рабочых праз клюб, ажыўленьне работы гурткоў, работу в кнігай і газэтай, кіно і г. д.

Уцягнуць у работу дэпутацкай групы 40 чал. з рабочага актыву і 10 дэлегатаў.

Устанавіць наступныя дні работы дэпутацкай групы чыгункі: 2, 12, 22 числа кожнага месяца.

Арганізаваць адзін раз у дэкаду дзяжурства членаў дэпутацкай групы для прыёму рознага роду скаргаў і прапаноў па рабоце Гарсавету. Устанавіць сталыя дэпутацкія пасты па наглядзе за выкананьнем асобных абавязацельстваў, вамацаваўшы арганізатарскую ролю дэпутатаў у барацьбе за добрую работу транспарту.

На выкананьне гэтых самаабавязацельстваў патрэбна накіраваць усю ўвагу дэпутацкай групе ст. Барысаў.

С.

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП НА ТРАНСПАРЦЕ.



Дэлегат зьлёту т. Іванькоўскі-прэм'яваны машыніст дэпо-Асіпавічы.

Вяч. Палескі

Крок у другое пяцігодзьдзе

транспарт, як і ўся народная гаспадарка Савецкага саюзу, штогод на ўзрае ўсё большым па велічыні і па хасьці тэмпы. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пралетарыят так пра вадзіць рэканструкцыю транспарту раз перамаганьне яго «вузкіх месц» по ён робіць ўдарным цэхам краіны, такім зьвяном, якое посьпехам сва работы забясьпечвае баявую рабо прамысловасьці і сельскай гаспадар

У выніку напружанай работы па рэ нструкцыі на транспарце мы дзелае ся буйнейшых гістарычна-значымых ясьпехаў. Так, дасьпяшыўшы ў раней ія гады шматлікія памылкі і прары, у 1931—32 годзе транспарт не паў ў, ён ліквідаваў іх. Гэта сьведчыць таго, што транспарт ідзе па шляху няўхільнага росту.

У 1931—32 годзе мы ў значнай сту ні перакрылі пляны перавозак ра ных год, у асноўным перавыканаў ны гадавы плян. У 1931—32 годзе мы возілі вагонаў зноў, што ў паўтара два разы больш, чым у папярэднія ды. Значна падвысіўшы разгружэна ружанных работы, мы ў значнай сту ні павялічылі камэрцыйную хутасьць вагонаў, а гэта значыць—паскорылі прасоўваньне грузаў.

Посьпехі перавозак у першую чаргу ўзнікла на посьпехах у аздараўлень паравознага і вагоннага паркаў.

У галіне аздараўленьня паравозага парку на транспарце дасягнуты гэтыя і біяспрэчныя посьпехі. Рашуча ыцяўляючы спаранную яладу, падшаючы якасьць і тэмпы работы, укаючы гаспразьлік у нізавым зьвяі і праз мабілізацыю ўсіх паравозаў на барацьбу за здаровы паравоз по забясьпечыць сваю карэнную абудову і друх у бок палепшаньня яго парку. Першы і другі ўсесаюзныя конкурсы на лепшую спаранную ладу выкрылі тыя гэвізіяны, але за ныя магчымасьці, якія ёсьць у транспартнай гаспадары, сярод тысяч паравозьнікаў. Гэтыя выкрытыя магчымасьці пашлі ў работу, і нізавыя ны — партгрупы, спаранныя брыгады—прагрэсыўна патнай ўверх яры ы сваёй карыснай работы.

Калі ў галіне аздараўленьня паравозаў гаспадарка ня дамагаліся рэзка

работу па скарыстаньні вагоннага парку на Жлобінскім чыгуначным раёне, калі на ім зварот вагонаў у сакавіку 1932 году роўны звароту вагонаў у адпаведным месяцы 1931 году? Як можна прызнаць здавальняючай такую работу, калі на працягу году скарыстоўваньне вагонаў стаяла на пункце замярзаньня?

Канстатуючы посьпехі ў прасоўваньні грузаў, у падвышэньні карыснай работы вагонаў на некаторых вузлах, у гаспадарчым звароце вагонаў, трэба канстатаваць і тое, што аздараўленьне вагонаў, зьнижэньне процанту хворых вагонаў, а адсюль і 100 процантная эксплёатацыя ўсяго вагоннага парку—не на вышыні.

Перамагаючы ўсе свае «вузкія месцы», няўхільна ідучы па шляху прарэсыўнага росту, перавыконваючы свае намечаныя заданьні, транспарт усё-ж яшчэ ня поўнасьцю забясьпечыў патрэбы сацыялістычных прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі, якія растуць значна большымі тэмпамі, чым транспарт.

Вось чаму сёлетні год, чацьвёрты за ключны год першай пяцігодкі і першыя гады другой пяцігодкі зьяўляюцца рашаючым пэрыядам у канчатковым падцягваньні транспарту да агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Асеньня-зімовыя перавозкі, падрыхтоўка да якіх патрабуе неадкладнага фарсаваньня і напружаньня тэмпаў, па сутнасьці зьяўляюцца папярэднім і першым этапам работы транспартнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы. Галоўная задача другой пяцігодкі—падвядзець не пад транспарт зьясокатэхнічнай базы і канчатковая ліквідацыя яго аставаньня—павінна стаць у цэнтр увагі і на час асеньня-зімовых перавозак. Сёлетнія асеньня-зімовыя перавозкі, пляны якіх распасьюджваюцца і на пачатак першага году другой пяцігодкі, па вінны зьявіцца такім устойлівым трамплінам, адштурхнуўшыся ад якога можна было-б няўхільна і ўпарта ісьці па шляху завяршэньня рэканструкцыі транспарту, ісьці да стварэньня першай на магутнасьці ў сьвеце паравознай гаспадаркі.

Задачы, пастаўленыя папераду перад асеньня-зімовымі перавозкамі—гэта за завяршэньня першай пяцігодкі і пачатку другой пяцігодкі.

бываюць выключна зажнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Вось чаму на выкананьне гэтых важнейшых праграмных дакумантаў трэба пакласьці ўсе намаганьні і энэргію. Вось чаму асеньня-зімовыя перавозкі—асноўны ву частак транспартнай работы, вакол якога павінна быць сканцэнтравана ўвага ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый і гаспадарнікаў, увага ўсяе грамадзкасьці, усяго пралетарыяту.

Шырока разгорнутая масавая падрыхтоўка да перавозак забясьпечыць іх посьпех. Тут асабліва патрэбна мабілізацыя ўсіх зьвеньняў партработы, усіх рабочых на тое, каб адказны і бадзявы экзамен вытрымаць. Тут асабліва патрэбна тое, каб кожны вучастак меў сваю аперацыйна-канкрэтную праграму дзеяньняў, сваё штодзённае заданьне, якое выходзіць з агульнага заданьня тае ці іншае транспартнае адзінкі.

Па-другое, трэба зараз-жа павесьці барацьбу супроць апартуністычных разважаньняў вакол плянаў асеньня-зімовых перавозак, якімі ўжо хварэюць некаторыя работнікі на транспарце.

Частка работнікаў, не зразумеўшы таго, што павялічаныя пляны перавозак патрабуюць ад транспарту ў першую чаргу больш чоткага скарыстаньня наяўнага рухомага складу, разважаюць:

— У нас вырасьлі перавозачныя пляны. Але ў нас не павялічылася колькасьць рухомага складу. І таму мы пляны ня можам выканаць.

Паравоза і вагонабудаўнічыя заводы ў гэтым годзе папоўняць наяўныя рэзэрвы рухомых сродкаў на транспарце. Але, зусім зразумела, што поўнасьцю забясьпечыць патрэбы заводы ня змогуць. Аднак, гэта ні ў якай ступені ня значыць, што для прузаў асеньня-зімовых перавозак ня хопіць вагонаў і паравозаў. Наадварот. Пры ўмове сапраўды бальшавіцкай работы, пры ўмове скарыстаньня ўсіх сродкаў і рэсурсаў зусім магчыма астача рухомага складу.

Пры якіх-жа ўмовах мы зможам забясьпечыць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак э тым, наяўным па-

цавалі раней і выконвалі пляны папярэдняга году, якія былі значна ніжэй сёлетніх?

Першай і рашаючай умовай выкананьня сёлетніх перавозачных плянаў пры сёнешняй наяўнасьці рухомага складу зьяўляецца правільнае і рацыянальнае скарыстоўваньне паравознага парку.

Як могуць некаторыя патрабаваць да датковае папаўненьне паравознага парку, калі ў іх у сваім-жа дэпо пад рамонтам прастойваюць паравозы, калі процант хворых паравозаў не даведзен да мінімальнай нормы, калі карысная праца не даведзена да плянавага заданьня. А паасобныя моманты такога агіднага скарыстоўваньня паравозаў яшчэ ёсьць на кожным вузле, у кожным дэпо.

Ужо зараз трэба ўзмацніць рамонт паравозаў. Па-ўдарнаму і добраякасна правесьці яго—гэта значыць цалкам і поўнасьцю забясьпечыць сябе патрэбнай колькасьцю паравозаў, якія будуць здольны з перавышэньнем выканаць сваю рабочую нагрузку. Штодзённа клапаціцца аб здарсўі паравозаў, укараніць у работу спаранных брыгад сацыялістычныя мэтады працы—гэта значыць штодзённа мець у сваім дэпо такую колькасьць паравозаў, якая забясьпечвала-б плянавы рух загружаных вагонаў на вузле.

Трэба ўсямерна ўмацоўваць посьпехі другога ўсесаюзнага конкурсу спаранных, і тым больш, што ўсебеларускі конкурс на лепшае дэпо працягнуты да 30 чэрвеня. Там, дзе посьпехі конкурсу замацоўваюцца, там ёсьць рост крывой здароўя паравозаў. Гэта, напрыклад, можна сказаць пра дэпо Віцебск, якое ў ранейшым шло апошным, а зараз, праз рашучае замацаваньне выніка конкурсу, падцягваецца да перадавых. Гэта можна сказаць пра дэпо Асіпавічы, якое дамагло таго, што зараз праводзіць у сябе пад'ёмачны рамонт, чаго не магло рабіць у сябе ў ранейшым.

Усе 12 умоў, якія сталі перад конкурсным паравозамі, зараз пасіўны стаць праграмнымі ўмовамі ў рабоце

брыгады, кожнага паравозьніка. Работу трэба арганізоўваць так, каб 12 умоў па конкурсе былі яшчэ і яшчэ раз шырока папулярызаваны сярод чыгуначнікаў. Барацьба за здаровы паравоз павінна ажыцьцяўляцца ўменна праз замацаваньне ўжо дасягнутых вынікаў і праз далейшае выкананьне 12 умоў конкурсу.

Асаблівую ўвагу трэба аддаць пытаньням зьменна-сустрэчнага плянаваньня кожнай низовой адзінкі дэпо. Нажаль, у гэтым напрамку зусім яшчэ мала чаго зроблена і месячнік зменна-сустрэчнага плянаваньня, які канчаецца 1 чэрвеня, не зрабіў таго эрыху, які ад яго чакаўся.

Значыць, **першая і рашаючая ўмова** выкананьня перавозачных плянаў пры сёнешняй наяўнасьці паравознага парку **заключаецца ў сапраўды бальшавіцкай, у сапраўды чоткай барацьбе за аздараўленьне паравозаў, за рацыянальнае скарыстоўваньне іх.** І калі гэтую работу мы паставім як належыць, калі гэтаму аонбуначу ачастку мы аддамо патрэбную і вартую ўвагу—мы будзем мець дадатковыя дзесяткі паравозаў, мы будзем мець такую колькасьць рабочых паравозаў, якія цалкам забясьпечаць выкананьне зусім рэальных плянаў па перавозках.

Другой умовай выкананьня перавозачных плянаў пры той колькасьці вагонаў, якія знаходзяцца на чыгуначных дарогах БССР, з якімі мы выконвалі пляны папярэдніх год, зьяўляецца рашучая барацьба за здаровы вагонны парк.

Абменныя пункты, арганізаваныя па моек дарогамі, маюць у сваёй рабоце рад перабояў і непаладак. Частка пуцёвкаў, замест сапраўднага аздараўленьня вагонаў, займаліся толькі спаганьнем штрафаў, пісаньнем пратаколаў. Асабліва дрэнна працаваў Гомельскі пункт, і толькі зараз у яго рабоце вызначыўся некаторы зрух.

Абменныя пункты павінны стаць вагоннымі майстэрнямі, добра абсталяванымі, укамплектаванымі кваліфікаванай рабочай сілай.

У меншай меры датычыцца і абменных пунктаў, як і ўсіх майстэрняў на вузлах і ў раёнах. Аздаравіцельная кампанія павінна быць праведзена так, каб асеньня-зімовы грузапаток атры маў добрабасталяваныя вагоны і ў патрэбнай колькасьці. За гэтую колькасьць вагонаў трэба змагацца іменна праз зьнижэньне процанту хворых вагонаў, праз лепшае скарыстоўваньне наяўных паравозачных сродкаў.

Як-жа праводзіцца ў жыцьцё галоўнейшая ўмова скарыстаньня вагоннага парку—маршрутызацыя і спэцыялізацыя цягнікоў? Трэба проста сказаць, што ў гэтай справе існуе страшэнная абязьлічка. Станцыі імкнуцца перакласьці сваю работу на плечы іншых. Гомель ня прач прысылаць дрэнныя маршруты ў Жлобін, Калінкавічы, ня прач прысылаць такія-ж маршруты з Жлобіна ў Жлобін у Гомель. Станцыі спадзяючыся што іх маршрутызацыю і спэцыялізацыю скончыць нехта іншы, замарджваюць зварот вагонаў, стварацоць дубліраваньні, непрадуктыўныя прастоі, перашкаджаюць падвышэньню карыснай работы вагонаў.

За складаньне маршрутаў трэба ўстанавіць адказнасьць канкрэтных людзей і трэба весьці ўлік гэтае адказнасьці. Вопыт работы—паравозная гаспадарка неадкладна перанесьці і скарыстаць у рабоце вагоннага парку.

Значыць, **другая ўмова** выкананьня плянаў асеньня-зімовых перавозак пры сёнешняй наяўнасьці вагонаў **заключаецца ў сапраўды бальшавіцкай, у сапраўды чоткай барацьбе за здаровы вагонны парк.** І тады, калі аздаравіцельная кампанія будзе праведзена як сьлед, калі процант хворых паравозаў будзе давядзены да нормы, калі будуць ліквідаваны «сустрэчныя» перавозкі, а вагоны будуць рацыянальна скарыстоўвацца—тады чыгункі пусьцяць у эксплёатацыю новыя тысячы вагонаў і цалкам забясьпечаць патрэбы асеньня-зімовага грузапатоку.

Нарэшце, прагрэдзеньне асеньня-зімовых перавозак цесна зьвязана з пракладкай новых дарог, з эксплёатацыяй новых рэек, з правядзеньнем другіх калеяў там, дзе зараз ёсьць толькі аднакалейныя дарогі. Трэба самымі ўзмоцненымі тэмпамі фарсаваць будаўніцтва новых ліній.

Выкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак—першага непарэднага этапу работы ў другой пяцігодцы—павінна стаць справай гонару ня толькі кож

летара, кожнага працоўнага. Трэба каб кожны загон, саставу, паравоз хадзілі пад пільным наглядам усяе пралетарскае грамадзкасьці.

Ад кожнай адзінкі патрабуецца чоткасьць і дакладнасьць. Без рэалізацыі шасьці ўмоў т. Сталіна ня мысліцца пасьпяховае выкананьне перавозачных плянаў. Барацьба за гэтыя ўмовы павінна прасякнуць абсалютна кожны вучастак работы, кожны працэс транспартнай вытворчасьці.

Патрэбна строгая канкрэтызацыя кіраўніцтва партыйных і прафсаюзных арганізацый, пераключэньне цэнтра работы ў низавое зьвяно. А гэта значыць, што посьпех асеньня-зімовых перавозак можа быць дасягнуты толькі пры правільным бальшавіцкім кіраўніцтве партыйных арганізацый. **Партгрупы на кожным вузле, у дэпо, на абменным пункце павінны стаць такімі зьвеньнямі, якія апэрацыйна арганізоўваюць, штодзённа кіруюць барацьбой за выкананьне перавозачных плянаў.**

Роля перадавога прыкладу кожнага камуніста на транспарце—гэта стымул для падцягваньня адстаючых. Умаваньне працоўнай дысцыпліны, у якім выключнае значэньне адыгрывае сілы прыкладу камуніста, павінна быць на патрэбнай вышыні.

Нарэшце, трэба памятаць, што змагаючыся за пляны асеньня-зімовых перавозак, мы змагаемся за пасьпяховае завяршэньне першай пяцігодкі і робім першыя крокі ў другой пяцігодцы.

Трэба памятаць, што змагаючыся за пляны асеньня-зімовых перавозак і пасьпяхова завяршыўшы іх выкананьне, мы зробім грандыёзныя крокі па шляху пабудовы бясклясавага грамадзтва, па шляху пабудовы магутнішага ў сьвеце транспарту. Памятуючы гэта, трэба ўсе сілы транспартных рабочых, усіх рабочых сацыялістычных прадпрыемстваў пад кіраўніцтвам партарганізацый мабілізоўваць на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак

Усебеларуская канфэрэнцыя

па навукова-дасьледчай рабоце ў БССР у другой пяцігодцы

Дзеньнік канфэрэнцыі

◆ На вячэрнім паседжаньні 26 мая канфэрэнцыя заслухала даклад прэзыдэнта БАН тав. **Горына** аб навукова - дасьледчай рабоце ў БССР у другой пяцігодцы.

◆ Канфэрэнцыю віталі рабочыя мейскага заводу імя **Варашылава**, якія паставілі перад навукова - дасьледчымі ўстановамі, перад БАН за дачу шырокага разгортваньня навукова - дасьледчай работы ў мэтах поўнага скарыстаньня прыродных багацьцяў БССР для разьвіцьця прамысловасьці БССР, у прыватнасьці разгортваньне навукова - дасьледчай работы па скарыстаньні жалезьняку, якія ёсьць у БССР.

◆ На ранішнім паседжаньні 27 мая адбываліся спрэчкі па дакладзе прэзыдэнта БАН тав. Горына.

Частка салі навуковай канфэрэнцыі.

Супроць нацыянальнага ўціску ў Заходняй Беларусі!

Супроць паходу польскага фашызму на беларускую культуру!

Рэзалюцыя Усебеларускай канфэрэнцыі навуковых працаўнікоў

Заслухаўшы інфармацыю тав. Рак-Міхайлоўскага аб разгроме польскай дэфэнзывай адзінай у Заходняй Беларусі легальнай культурна - асьветніцкай арганізацыі рабочых і сялян **Таварыства Беларускай Школы**, аб масавых арыштах членаў ТБШ і ліквідацыі беларускай культурна - асьветніцкай справы — **Усебеларуская канфэрэнцыя навуковых працаўнікоў рашуча пратэстуе супроць азьвярэлага паходу польскага фашызму на беларускую культуру і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.**

Польскі імпэрыялізм, які задыхаецца ў атмасфэры эканамічнага крызісу, ахоплен гарачкай ваеннай падрыхтоўкі да інтэрвэнцыі супроць СССР. Зьніжаецца зарплата працоўным, ліквідуюцца міэрныя рэшткі сацыяльных заваёў, сыплюцца новыя бязьмерныя падаткі. Новая хваля вайсковага асадніцтва скіроўваецца на акупаваньне польскім імпэрыялізмам у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Палявымі судамі, шыбеніцамі, карнымі экспэдыцыямі і катаваньнем палітзьняволеных, намагаецца азьвярэлы фашызм задушыць магутны рост рэвалюцыйнай хвалі.

Пад напорам рэвалюцыйных працоўных мас здраднікі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, Астроўскі, Луцкевіч, Акімчыц, як верныя агенты белапольскіх акупантаў, прымушаны прызнаць сваё параджэньне. Усе намаганьні сфашызаваць ТБШ праваліліся. Рабочая - сялянскія масы Заходняй Беларусі гераічна адбіваюць усе атакі акупантаў. Польскі фашызм прыступіў да канчатковай ліквідацыі культурна - асьветніцкай справы працоўных. Лепшых рэвалюцыйных рабочых і сялян арыштоўваюць, катуюць, судзяць і кідаюць у турмы на павольнае вымираньне. У свой час фашысцкі ўрад Польшчы ўзьнімаў голас у прэсе аб тым, што у БССР ніпчыцца нацыянальная беларуская культура, нацыянальная беларуская школа.

Усебеларуская канфэрэнцыя навуковых працаўнікоў заяўляе, што ў БССР ёсьць 49 навукова - дасьледчых інстытутаў і зональных станцый, 32 вышэйшыя навучальныя ўстановы, сотні тэхнікумаў, рабфакаў і тысячы пачатковых школ, у якіх сотні тысяч пралетарскіх дзяцей вучацца на іх роднай мове, тады як у Польшчы за крываюцца ўсе беларускія пачатковыя школы, беларускія гімназіі ў Гарадку, Радашковічах, і Клецку і беларуская настаўніцкая сэмінарыя ў Вільні. Польскі фашызм вядзе цяпер наступ на апошнія дзьве гімназіі — у Вільні і Навагрудку. Нядаўна сканфіскавана і закрыта на першым нумары адзіная рабоча - сялянская газэта «Беларускае Жыцьцё» ў Львове.

Разгорнуўшы масавую рабоча - сялянскую «Грамаду», задушыўшы беларускую культурна - асьветніцкую працу, зьліквідаваўшы канчаткова беларускае школьніцтва, адзіную легальную арганізацыю ТБШ і прэсу, польскі фашызм спадзяецца зьнішчыць у корані шырокі рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, каб расчысьціць сабе пляцдарм для нападу на СССР. Польскі фашызм бачыць выхад з эканамічнага крызісу ў вайне, а пралетарыят і шырокія масы працоўных Заходняй Беларусі бачаць выхад са свайго сучаснага становішча толькі ў сацыяльнай рэвалюцыі.

Дэлегат канфэрэнцыі — акадэмік **АФАНАСЬЕЎ.**

Салідарызуючыся з рэвалюцыйнымі працоўнымі масамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, **мы патрабуем ад польскіх «цывілізатараў» — акупантаў спыніць паход супроць ТБШ і беларускага школьніцтва. Мы кляймім ганьбой здрадніка ў працоўных мас Астроўскіх, Луцкевічаў і Акімчыцаў — верных служак польскага фашызму. Мы патрабуем вызваліць здрадніцкі кінутага за краты акадэміка тав. Тарашкевіча, рабоча - сялянскіх дэпутатаў Заходняй Беларусі тав. Валошына, Дварчаніна, Гаўрыліка, Валынца, Крынчыка і ўсіх палітзьняволеных рабочых і сялян. Усім вязьням капіталу, ахвярам польскага фашызму шлем палкае пралетарскае прывітаньне. Прэч польскіх фашысцкіх акупантаў, душыцеляў рабочых і сялян Заходняй Беларусі! Прэч крывавыя рукі ад ТБШ! Нахай жыве рэвалюцыйная нацыянальна - вызваленчая барацьба рабочых і сялян Заходняй Беларусі!**

Апраўдваюць ролю арганізатараў калгасных мас

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Пуцімельская партыйная ячэйка пытаньню выданьня насьценгазэт і разгортваньню работы па конкурсе «Праўды» да апошняга часу не надавала належнай увагі. Толькі зараз, калі партыйная і камсамольская ячэйкі сталі на чале кіраўніцтва нізавым друкам, намецілася пералом.

У калгасе «Расьсьвет» насьценгазэта стала сапраўдным арганізатарам мас на барацьбу за посьпяховае заканчэньне сяўбы. Газэта з нумару ў нумар адбівае працу калгасу, выкрывае гультаёў, прагульшчыкаў, паказвае лепшых ударнікаў. Калгас «Расьсьвет», дзякуючы баявой рабоце насьценгазэты **«Ударнік»**, першым у сельсавеце вышаў у поле поўнасьцю падрыхтаваным. Зараз у калгасе ўзараны ўвесь яравы клін і засеяна 15 га ячменю. Праца ў калгасе «Расьсьвет» арганізавана на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага. Праўленьнем калгасу рэдкалегія насьценгазэты за добрую работу прэм'іявана.

Насьценгазэта ў калгасе «Бальшавік» мела нмат недахопаў. Газэта не паказвала сапраўднай барацьбы брыгад калгасу за посьпехі бальшавіцкай вясны, за ўраджай. Зараз гэтыя недахопы пад кіраўніцтвам партыячэйкі выпраўляюцца. Адбіваючы работу брыгад, насьценгазэта калгасу «Бальшавік»—**«За ўдарную працу»** у нумары 6 піша: «Дзякуючы добрану кіраўніцтву брыгадзіра Карасева Р., брыгада № 1 у поўнай гатоўнасьці выехала ў поле. Трэба раўняцца па ёй. У выніку дрэннага кіраўніцтва брыгадзіра Бадзякі А. брыгада № 5 вышла ў поле не падрыхтаванай, трэба ўзяць яе на буксір...». Газэта выкрывае гультаёў і згуртоўвае перадавых калгасьнікаў на барацьбу з імі.

Таксама добры вопыт барацьбы за брыгадную насьценгазэту паказаў нізавы друк калгасу «Кастрычнік» (Макеевіцкага сельсавету). У гэтым калгасе зараз па брыгадах выдаецца жаля 30 баявых штодзённак. Калгас першым ідзе ў раёне па разгортваньні сяўбы.

Па-баявому пачала працаваць насьценгазэта калгасу «Шлях да сацыялізму», Галіцкага сельсавету. Уся ўвага насьценгазэты накіравана на выкананьне ўмоў конкурсу «Праўды», на барацьбу за праграму й якасьць сяўбы. Газэта шырока асьвятляе ход спаборніцтва паміж брыгадамі.

Разгорнута работа па выданьні брыгадных штодзённак у калгасах Дубравіцкага сельсавету, дзе да гэтага часу зусім мала зварочвалася ўвагі на разгортваньне нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Замацоўваючы дасягнутыя посьпехі ў разгортваньні нізавога друку, неабходна яшчэ больш пашырыць і ўзмацніць барацьбу нізавога друку калгасаў за баявую праграму бальшавіцкай сяўбы.

П. Казалёў.

За тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР

5-га чэрвеня ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ

дэпутацкіх груп мэталёвай прамысловасьці

Падрыхтоўка да зьлёту—у цэнтр увагі

Тав. Чарвякоў аб зьлёце

25 мая брыгада «Известий ЦИК СССР и ВЦИК», прыбыўшая ў Менск у сувязі са скліканьнем усебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталязаводаў сумесна з прадстаўніком газэты «Савецкая Беларусь» была прынята старшынёй ЦВК БССР тав. А. Г. Чарвяковым.

У гутарцы з брыгадай тав. Чарвякоў заявіў:

Зьлёт прысьвячаецца барацьбе дэпутацкіх груп за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР, аўладаньне навейшай тэхнікай, пытаньням выкананьня заказаў чорнай мэталургіі і пытаньням савецкай работы на прадпрыемствах. Амаль на ўсіх мэталязаводах Беларусі вырабляецца абсталяваньне, якое раней прывозілася з-за граніцы. Таму ўсебеларускі зьлёт набывае зусім выключнае значэньне. Аднак, зьлёт дасьць належны эфэкт толькі ў тым выпадку, калі ён будзе праведзен як зьлёт паказу. Кожная дэпутацкая група мэталязаводу павінна прадэманстраваць перад зьлётам вопыт канкрэтнай работы ў якой-небудзь адной галіне. Напрыклад, у галіне барацьбы за вынаходніцтва, або ў галіне барацьбы за эканомію мэталю, за рацыяналізацыю вытворчасьці, што ў сваю чаргу павінна садзейнічаць у справе хутчэйшага вызваленьня ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці Саюзу.

На гарсаветы ўскладаецца абавязак паказаць вопыт канкрэтнага кіраўніцтва работай дэпутацкіх груп, а на партыйныя арганізацыі мэталязаводаў—вопыт партыйнага кіраўніцтва дэпутатамі, вопыт барацьбы дэпутацкіх груп у галіне палепшаньня рабочага забесьпячэньня.

Ніякай мітынгоўшчыны, парадняцьці на зьлёце быць не павінна. Трэба зрабіць так, каб прадстаўнікі рабочых мас—дэпутаты маглі-б на зьлёце як трэба шырока асьвятліць барацьбу пралетарыяту за тэхніка-эканамічную незалежнасьць сваёй краіны і ролю ў гэтай барацьбе дэпутацкіх груп.

Мы запрасілі на зьлёт дэпутацкую групу маскоўскага заводу «Дынамо»—пачынальніка паходу заводаў за тэхніка - эканамічную незалежнасьць СССР. Гэта добра, але трэба таксама запрасіць на зьлёт дэпутацкую групу аднаго з перадавых заводаў Ленінграда.

У справе, пачатай намі, павінны прыняць удзел рабочыя—ударніні і спэцыялісты.

Зьлёт павінен зьявіцца штуршком да яшчэ большага разьвіцьця сацыспаборніцтва дэпутацкіх груп, у выніку якога мэталязаводы Беларусі ўступяць у другую пяцігодку з новымі посьпехамі.

Тав. Чарвякоў адзначыў ініцыяты ву газэты «Известия», якая хутка ўключылася па-баявому ў падрыхтоўку гэтай вялікай справы, што набывае ўсесаюзнае значэньне.

Тав. Чарвякоў падкрэсьліў недапушчальнае маўчаньне цэнтральных газэт БССР вакол гэтага пытаньня. Ніводная газэта за выключэньнем «Савецкай Беларусі» гэтай справай не заняла, не паставіўшы гэта вельмі важнае пытаньне на прынцыповую вышыню. Гэтую памылку газэты павінны за раз-жа выправіць, разгарнуўшы масавую работу вакол скліканьня ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталя прамысловасьці

Нарыхтоўшчыкі мэталялому—у палоне самацёку

Правільнай арганізацыяй збору мэталялому мы значна павялічваем рэсурсы забясьпечаньня мэталёвай прамысловасьці сыравінай. Аднак, збор мэталялому пастаўлен з рук вон дрэнна. Зборам займаюцца Кантора Мэталялому і Белуціль пры Белпражыўсаюзе. Як у мінулым, так і ў гэтым годзе, гэтыя арганізацыі сыстэматычна ня выконваюць сваіх заданьняў па тэй прычыне, што яны выключна спадзяюцца на самацёк у паступленьні мэталялому.

Разглядаючы разьліковыя спрэчкі паміж Беларускай канторай Мэталялому і Белуцілем, дзяржаўная арбітражная камісія пры СНК канстатавала, што нарыхтоўка мэталялёму ў мінулым годзе правалена (выканана ўсяго 30 проц. пляну), правальваецца яна і ў гэтым годзе (плян I кварталу выканан на 48,5 проц.).

Арбітраж, накладаючы спагнаньні на Белкапуціль за невыкананьне сваіх абавязацельстваў па дагаворы, высьвятліў разам з гэтым і прычыну правалу нарыхтоўкі лому. У Мэталялому і Белкапуцілю ёсьць спэцыяльныя інструктары на раёнах, але яны не мабілізуюць грамадзкасьць фабрык і заводаў на збор мэталалому, а спадзяюцца на самацёк у выніку гэтага плян збору правальваецца.

Мэталёзяч прамысловасьць чакае мэталялому. Дэпутацкія групы кожнага прадпрыемства павінны пакласьці ў аснову сваёй штодзённай работы адшукваньне дадатковых крыніц сыравіны для мэталяпрамысловасьці, шляхам мобілізацыі пралетарскай грамадзкасьці вакол гэтага пытаньня.

Кожная дэпутацкая група сумесна з партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі павінны рапартаваць зьлёту як яны змагаюцца за збор мэталялому.

Г.

Узор бальшавіцкай барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць

Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат зьяўляецца дзіцём сацыялістычнага будаўніцтва першай пяцігодкі. Таму ня дзіўна, што на камбінаце налічваецца звыш 6 тыс. рабочых і звыш 500 розных відаў варштатаў імпартнага абсталяваньня, якія зьяўляюцца вельмі складачымі па сваёй канструкцыі.

Аўладаньне тэхнікай работы замекнымі машынамі і варштатамі, выраб уласнымі сіламі запасных частак для гэтага абсталяваньня, усямерна скарацілі заяўкі на прывоз замежнага абсталяваньня—вось задача, якую паставіла перад сабой дэпутацкая група мэханічнага цэху Бабруйскага камбінату. У выніку ўпартай штодзённай бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне гэтай задачы дэпутацкая група дамаглася бліскучых рэзультатаў.

Калі раней верхнія і ніжнія зубчаткі, а таксама вілкі для аўтавозаў і грузавікоў Бабруйскі камбінат прывозіў з-за граніцы, дык цяпер пры непасрэдным удзеле дэпутацкай групы мэханічнага цэху выраб апошніх наладжан у сваёй уласнай мэханічнай майстэрні. Гэта дало эканомію краіне каля тысячы рублёў залатой валюты.

Роліковыя падшыпнікі да лесапільных рам да гэтага часу камбінат таксама прывозіў з-за граніцы, але цяпер сіламі рабочых і тэхнічнага персаналу пры актыўным удзеле дэпутацкай групы выраб апошніх наладжан у мэханічнай майстэрні камбінату. Прычым кошт роліку значна таней, чым замежных. Але гэтага мала.

Па ініцыятыве дэпутацкай групы мэханічнай майстэрняй наладжана рассточка блёкаў і галёўка алюміневых поршняў т. аўтавозаў і аўтамашын заводскага транспарту.

Адначасова з наладжаньнем выраб запасных частак для імпартнага абсталяваньня дэпутацкая група мабілізуе заводскую пралетарскую грамадзкасьць вакол пытаньня выкарыстаньня мэталялому, дабіўшыся ў гэтым кірунку рэальных вынікаў. Так, з водкіду мэталю дэпутацкая група выраблела 100 мэтраў востра дэфіцытнага ланцуга «Галя» для лесапільнага цэху. Апрача гэтага з чыгунных букс, якія раней утылізаваліся як чыгунны лом, дэпутацкая група мэханічнага цэху наладзіла ў сябе ў майстэрні вытачку колцаў для аўтамашын заводскага транспарту і гэтым самым с'эканоміла вялікую суму грошай. Такіх фактаў сотні, іх не пералічыць. Дэпутацкая група на справе вядзе барацьбу за тэхніка-эканамічную незалежнасьць Савецкага саюзу.

Рыхтуючыся да ўсебеларускага зьлёту дэпутацкая група ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў з тым, каб рапартаваць зьлёту аб іх поўным выкананьні і на самым зьлёце падзяліцца сваім вопытам у справе барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць сваёй краіны.

М-ні.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Паважаны таварыш рэдактар!

Сталінская эстафэта тэхнапрапаганды на транспарце, арганізаваная навуковымі працаўнікамі Маскоўскага эксплёатацыйнага інстытуту інжынэраў транспарта імя тав. СТАЛІНА,—брыгадамі ВАРНІТСО,—прыбыла ў Менск.

Гэта ёсьць другі рэйд эстафэты на транспарт.

Сталінская эстафэта адчынена 4-га лютага, у гадавіну гістарычнай прамовы тав. СТАЛІНА аб тэхнапрапагандзе, праводзіцца пад сьцягам XVII партыйнай канфэрэнцыі і мае асноўную задачу правесьці на транспарце пляновую тэхнапрапаганду ў розных формах. Сталінская эстафэта аб'яднае 40 навуковых працаўнікоў інстытуту і праходзіць па сандагавору на трох дарогах: М.-Бел.-Балт., М.-Каз. і М.-Курскай. Праца эстафэты ўдарна разгортваецца па трох наступных напрамках:

1) Арганізацыя і правядзеньне курсаў брыгадзіраў для рабочых паказаных чыгуначных шляхоў. Курсы трох спэцыяльнасьцяў: будаўнічай, эксплёатацыйна-тэхнічнай і эксплёатацыйна-камэрцыйнай. Курсы без адрыва ад вытворчасьці праводзяцца ў Сталінскім інстытуце.

2) Арганізацыя і правядзеньне на трох чыгуначных шляхох масавых навукова-тэхнічных лекцый і дакладаў на тэмы рэканструкцыі транспарту і спэцыялістычнага будаўніцтва.

1-шы рэйд (усходні). Маршрут: Масква—Разань—Казлоў—Пенза—Казань Масква. Рэйд скончан.

2-гі рэйд (заходні). Маршрут: Масква—Вязьма—Смаленск—Ворша—Менск—Віцебск—Вял. Лукі—Ржэў—Масква. Рэйд праходзіць у сучасны момант.

3-ці рэйд (паўднёвы). Маршрут: Масква—Кашыра—Вузлавая — Елец—Валуйкі—Харкаў—Курск—Арол—Тула—Масква. Рэйд ахапляе ўсю звышмагістраль Масква—Данбас і будзе праходзіць з 15-га чэрвеня.

3) Арганізацыя і правядзеньне ряду чыгуначных клюбаў Маскоўскага вузла ў галіне тэхнапрапаганды. Мэта—яна толькі агляд, але і рэальная дапамога клюбам.

Уся праца эстафэты праходзіць пад шэфствам транспартнай газэты «ГУДОК».

Улічваючы, што ваша газэта «Савецкая Беларусь» вычарпальна адбівае ўсе моманты сацыялістычнага жыцьця і будаўніцтва Саюзу, удзельнікі Сталінскай эстафэты просяць вас зьмесьціць гэты інфармацыйны ліст.

Удзельнікі рэйду Сталінскай эстафэты,—навуковыя працаўнікі Масквы,—вітаюць вашу газэту «Савецкая Беларусь», як яскравага выразьніка грамадзкай думкі пралетарыяту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, уваходзячай у склад Саюзу ССР і будуючай сумесна з другімі Саюзнымі рэспублікамі сацыялізм.

З таварыскім прывітаньнем:

Брыгадзір Сталінскай эстафэты тэхнапрапаганды на транспарце ВАРНІТСО
Прафэсар А. МАНУЙЛАЎ.
Члены Сталінскай эстафэты удзельнікі 2 рэйду
Прафэсар МАЙШАЎ П.
Прафэсар МІЦЮШЫН Н.
Дацэнт ІВАНОЎ.
Асыстэнт КУЛАГІН Е.
Асыстэнт ГРЫГОР'ЕЎ С.

Арганізуем збор кніг для вёскі

Да ўсіх навуковых работнікаў БССР

Таварышы! 3-га мая г. г. Цэнтральны Камітэт Ленінскага Камсамолу паставіў правесьці па гаралох і прамысловых раёнах СССР збор кніг для вёскі. Гэта мерапрыемства знайшло актыўнае падтрыманьне з боку нашага лепшага пралетарскага пісьменьніка тав. Максіма Горкага, які першы ў адказ на заклік камсамолу прапанаваў забраць у яго некалькі соцень кніг і зьвярнуўся да савецкай грамадзкасьці з просьбай падтрымаць надзвычайна актуальнае пачынаньне камсамолу.

Таварышы, навуковыя работнікі! Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых работнікаў заклікае Вас прыняць актыўнейшы ўдзел у справе, пачатай камсамолам.

Рост культурных запатрабаваньняў нашай вёскі, які зьяўляецца выкліканым ўздыму ўсяе нашае народнае гаспадаркі, патрабуе пасылкі ва ўсе куткі нашай вялікай краіны тысяч кніг, часопісаў, брашур. У кожнага з вас бязумоўна ёсьць кнігі, якія вы можаце сабраць для пасылкі на вёску.

Здавайце гэтыя кнігі, арганізуйце самі збор кніг, дапамажэце камсамолу ў адборы сапраўды карысных, ідэалёгічна вытрыманых кніжак, якія чакаюць калгасьнікі і працоўныя сяляне.

Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў выказвае ўпэўненасьць, што навуковыя працаўнікі БССР і ўсе мясцовыя арганізацыі сэкцыі па-ўдарнаму дапамогуць у выкананьні палітычнага мерапрыемства, якое праводзіцца Ленінскім Камсамолам.

Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў:

Старшыня ЦБ—акадэмік РЫЯЛІ
Член ЦБ—акадэмік ПАНКЕВІЧ, акадэмік ВАЛЬФСОН, інжынэр РОБІНАЎ, інжынэр МАЙ, прафэсар ГЕРШЭЛЬМАН, прафэсар ЯРМАЛЕНКА, прафэсар УСЬПЕНСКІ, дацэнт ШАПІРА, дацэнт РУДЗІЦКІ, дацэнт ГУСЕВА, дацэнт КРЫВІЦКІ, асыстэнт ДАНІЛЬЧЫК, аспірант РАЗУН.

Лябораторыя футровага покрову на «Бутырскім хутары» ў Маскве пад кіраўніцтвам праф. Ільліна дамаглася штучнай зьмены колера труса.

Па жаданьні мэтчыка на белым трусу насадзіць цёмныя плямы і наадварот—на чорным трусу—белыя плямы.

НА ЗДЫМКУ: вопыты з салаксам які скарыстоўваецца як фактар які можа ўплываць на больш хуткі рост фуры.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня — Новы гукавы гістарычны мастацкі фільм МЁРТВЫ ДОМ

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз. — КВАРТАЛЫ ПРАДМЕСЬЦЯ

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ — КНЯЖНА МЭРЫ

Беларускі Дзярж. Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ на 1 курс на наступныя факультэты:

1. Літаратурна-Лінгвістычны факультэт. Аддзяленьні: Лінгвістычнае беларуская група—30 асоб і яўрэйская група—20 асоб. Замежных моў—30 асоб Газэтна Выдавецкае—60 асоб. Крытычна-Творчае—30 асоб. Літаратурнае—польская група—20 асоб.
2. Сацыяльна-эканамічны факультэт. Аддзяленьні: Эканамічнае—беларуская група—30 асоб і яўрэйская група—20 асоб. Гістарычнае—беларуская група—30 асоб і польская група—20 асоб. Фізёфскае—беларуская група—30 асоб і яўрэйская група—20 асоб.
3. Пэдалёга-пэдагагічны факультэт. Аддзяленьні: Інспэктарскае—30 асоб. Пэдагагічнае—30 асоб. Дашкольнае камуністычнага руху—30 асоб. Пэдалёгічнае—30 асоб. Дэфэкталёгічнае—30 асоб.

Адначасова абвяшчаецца прыём у Вячэрні Вышэйшы Пэдінстытут на аддз.: Лінгвістычнае—30 асоб. Эканамічнае—30 асоб. Замежных моў—30 асоб 70 проц. студэнтаў дзённага інстытуту будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.

Прыём заяў да 1-га верасьня

Пачатак заняткаў са студэнтамі новага прыёму 1-га кастрычніка 1932 г.

Заявы з дакумэнтамі (абавязкова ў арыгіналах) аб адукацыі, сац. становішчы і нахожданьні, здароўі, годзе нараджэньня, аб адносінах да вайсковай павіннасьці, а таксама пасьведчаную анкету і 2 фота-карткі,—накіроўваць па адрасу: г. Менск, Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус, 2-гі паверх, пакой № 2-31, Вышэйшаму Пэдінстытуту.

Ч. в. а. дырэктара ВПІ КАЗАКОЎ

Нарсуд Любаньскага раёну на падставе свайго прысуду ад 27-II-32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне за нядбайныя адносіны да працы члену праўленьня калгасу «Новы шлях» Гаўрушковічу Васілю Антонаву.

Згублена рэгістрацыйнае пасьведчаньне 5 раз. стал ставак № 484, выд. Дзяржбанкам Мессель А. Я., лічыць несапраўдным

Згублена фота-абавязацельства № 31977 сэр. 1, выд. ашчад касай № 16, гр. Баброву С. Н., лічыць несапраўдным

Згублена дамавая кніга дому № 89 па Лагойскаму тракту, гр. Патук І. С., лічыць несапраўдным

Згублена валёабавязацельства № 069455, сэр. 2., выд. Барысаўскай райашчад асай гр. Валейталіс К. Я., лічыць несапраўдным

ЗГУБЛЕНЫ.

Часовае пасьведчаньне і саюзная кніжка, выд. Сьвіслацкім сельрабачкомам на імя Піліпенчыка Я. Т. Квіт № 789.

Членскі білет саюзу працасьветы, выд. Менсаюзам працасьветы за № 21699 на імя Федзюка Л. М. Квіт № 795.

Мэтрычны выпіс Раговіна С. А., выд. Менгазгасам. Квіт № 796.

Саюзны білет саюзу рабземлеса, выд. Жодзінскім рабачкомам на імя Шахно І. Б. Квіт № 797.

Пасьведчаньне Шахно І. Б., выд. Бэрэзінскім сельсаветам. Квіт № 798.

Пазвая кніжка, выд. Калодежскім сельпо на імя Шахно І. Б. Квіт № 799.

Атэстат выданы 18-й сямігодкай на імя Крэндзель К. І. Кв. № 800.

Саюзны білет Маркевіча І. Э., выд. саюзам саўгандльслужачых. Квіт

Вайсковы білет Файна С. М., выд. Менскрваенкаматам. Кв. № 802.

Белы білет Наўроцкага В. І., выд. Менскім Ваенкаматам. Квіт № 803.

Саюзны білет Наўроцкага В. І., выд. 3-м групкомам. Квіт № 804.

Згодна пастановы Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства Саюзу ССР ад 5 красавіка 1932 году

Беларускі Саюзны Трэст Сьвінагадоўчых саўгасаў (БЕЛСЬВІНАВОДТРЭСТ), УВАХОДЗЯЧЫ Ў СЫСТЭМУ САЮЗНАГА СЬВІНАВОДАБ'ЯДНАНЬНЯ,

з 1-га чэрвеня 1932 г. РЭАРГАНІЗУЕЦЦА

на тры ніжэйнаступныя самастойныя трэсты сыстэмы саюзнага Сьвінаводаб'яднаньня.

I. Менскі Саюзны Трэст сьвінагадоўчых саўгасаў, з месцам разьмяшчэньня трэсту ў г. Менску па Савецкай вул., у доме № 70 (тэлеграфны адрас трэсту: Менск, Сьвінаводтрэст), з кантакарэнтным рахункам у Менскім Дзяржбанку.

У склад Менскага трэсту уваходзяць наступныя саўгасы:

1. Вішнеўка Менскага раёну
2. Першае Мая »
3. Горкі Абчак »
4. Негарэлае Койданаўска а раёну
5. Сталіна »
6. Сьвярдлова »
7. Бранчыцы Слуцкага раёну
8. 14 партызан »
9. Замошша Плешчаніцкага раёну
10. Мсьціж Бягомльскага раёну
11. Луцаўшчына Лагойскага раёну
12. Зара Захада Заслаўскага раёну
13. Беларусь »
14. Кухцічы Вузьдзенскага раёну
15. Дзяржынскага Капыльскага раёну
16. Боркі Бялевічы Чырв.-Слабодзкага р.
17. Старчыны »
18. Палелюм Барысаўскага раёну
19. Зарэчча Смалявіцкага раёну
20. Антанопаль »
21. Вызваленьне »
22. Вялень Пухавіцкага раёну
23. Весава Глускага раёну
24. Харомцы »
25. Новыя Зялёнкі Чэрвеньскага раёну
26. Бухзёнавец »

II. Аршанскі Саюзны Трэст сьвінагадоўчых саўгасаў, з месцам разьмяшчэньня трэсту ў г. Воршы ў Доме саюзаў (тэлеграфны адрас трэсту: Ворша, Сьвінаводтрэст), з кантакарэнтным рахункам у Аршанскім Аддзяленьні Дзяржбанку.

У склад Аршанскага трэсту ўваходзяць наступныя саўгасы:

1. Бановь Полацкага раёну
2. Вароначы »
3. Бачайкава Бешанковіцкага раёну
4. Пачаевічы Чашніцкага раёну
5. Халошенічы Крупскага раёну
6. Каменка »
7. Крупкі »
8. Дрыбін Горацкага раёну
9. Прагрэс »
10. Халоўя Дубровенскага раёну
11. Брацькавічы Касьцюковіцкага р-ну
12. Розальмова »
13. Сялецк »
14. Канічы »
15. Чырвоны Сьцяг Мсьціслаўльскага р.
16. Добрае »
17. Лемніца Талачынскага раёну
18. Крывое »
19. Усьцьце Аршанскага раёну
20. Бабінічы »
21. Копысь »
22. Камсамольск. Праўда »
23. Саматэвічы Касьцюковіцкага раёну
24. Высокае Клімавіцкага раёну
25. 16 Партзьезд »
26. Прывольле »
27. Калініна Чырвонапольскага раёну

III. Магілеўскі Саюзны Трэст сьвінагадоўчых саўгасаў, з месцам разьмяшчэньня трэсту ў г. Магілеве, па вуліцы Каляева, дом № 7 (тэлеграфны адрас трэсту: Магілеў Сьвінаводтрэст), з кантакарэнтным рахункам у Магілеўскім Аддзяленьні Дзяржбанку.

У склад Магілеўскага трэсту ўваходзяць наступныя саўгасы:

1. Посата Клічаўскага раёну
2. Бацэвічы »
3. Красіна »
4. Цацерына Бялыніцкага раёну
5. Варашылава »
6. Ялава Чавускага раёну
7. Паўлаўка »
8. Вайніды »
9. Лудчыцы Быхаўскага раёну
10. Чырвоны Маяк »
11. Блюхэра Веткаўскага раёну
12. Імя Гея Жлобінскага раёну
13. Варацьбіт Крычаўскага раёну
14. Крычаў »
15. Жалязёнка Прапойскага раёну
16. Чарвякоўка »
17. Красьніца Рагачоўскага раёну
18. Стара-Белица Уваравіцкага раёну
19. Васільеўск Гомельскага раёну
20. Посавічы Церахоўскага раёну
21. Чырв. Кастрычнік Чэрыкаўскага р.
22. Уд рнік »
23. Вейна Магілеўскага раёну
24. Гарэдок »

З 1 чэрвеня 1932 г. апэрацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва саўгасамі пераходзіць да ўноў арганізаваных трэстаў

Усе ўстановы і асобы, якія да паказаных вышэй саўгасаў маюць справы і прэтэнзіі, павінны з 1 чэрвеня 1932 г. для ўрэгуляваньня апошніх зварочвацца непасрэдна ў адпаведны трэст, у склад якога ўвайшоў саўгас пры рэарганізацыі

Па даручэньні „Сьвінаводаб'яднаньня“

Дырэктар Белсьвінаводтрэсту АЎЧЫНІКАЎ

Друкарня